ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 ЛІСТАПАДА 2014 г. ЧАЦВЕР № 220 (27830) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Мікітаў дар

Жыццё ў стылі... анімэ

ЛІЧБА ДНЯ

Br3,1 трлн,

або 0,6% ВУП, склаў прафіцыт кансалідаванага бюджэту ў студзені—верасні гэтага года. Гэта ў пэўнай меры было абумоўлена стрымліваннем бюджэтных выдаткаў. Па выніках 9 месяцаў, даходы кансалідаванага бюджэту ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам павялічыліся на 9% і склалі Br151,6 трлн. Асноўная іх доля (86,8%) фарміруецца за кошт падатковых паступленняў. За студзень—верасень у бюджэт паступіла Br131,5 трлн падатковых даходаў. У параўнанні з мінулым годам гэтыя паступленні павялічыліся на 7,2%. Непадатковыя даходы за 9 месяцаў у параўнанні з дзевяццю месяцамі 2013-га павялічыліся на 19,2%. Расходы кансалідаванага бюджэту ў студзені—верасні прафінансаваны ў суме Br148,5 трлн (на 1% ніжэй за ўзровень аналагічнага перыяду 2013 года ў рэальным выражэнні).

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.11.2014 г.

Долар ЗША	10770,00	■
Еўра	13480,00	▲
Рас. руб.	229,50	▲
Укр. грыўня	708,55	▲

ISSN 1990 - 763X
14220
9 771990 763008

«А вы накцюрн сыграць маглі б?..»

Класік савецкай паэзіі Уладзімір Маякоўскі прапаноўваў гэта зрабіць «на флейце вадасцёкавых труб». У мінскага мантажніка вентыляцыйнага абсталявання Аляксандра ЗЕЛЯНКО трубы на абслугоўванні іншыя — больш маштабныя, і «мелодыка» ў іх зусім не тая. Але галоўнае — творча падыходзіць да любой справы і выконваць яе з душой, упэўнены малады майстар.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

МЕКСІКАНСКІЯ МУЧАЧАС ГУЧНА ПЛАЧУЦЬ,

альбо Як беларускія футбалісты ў таварыскім матчы перайгралі адну з наймацнейшых зборных свету

Прыезд адной з лепшых каманд сёлетняга чэмпіянату свету ў Беларусь спачатку выклікаў «ваў-эфект», які пасля, мякка кажучы, няўдалага выступлення беларускай зборнай у адборачных матчах Еўра-2016 пераўтварыўся ў здаровую асцярогу.

Тым больш, што **галоўны трэнер зборнай Мексікі Мігель Эрэра** прывёз у Еўропу, дзе цяпер холадна, досыць моцную каманду. Да нас нават завітаў адзін з лепшых галкіпераў бразільскага «мундзіяля» Гільерма Ачоа. Праўда, Эрэра так і не выпусціў героя «ацтэкаў» на барысаўскае поле, патлумачыўшы гэта тым, што і так ведае магчымасці гэтага варатара. Магчыма, падобная недаацэнка сапернікаў і паўплывала на фінальны вынік. Дарэчы, «недаацэнка сапернікаў» — гэта таксама паслямаччавая рэмарка трэнера мексіканцаў...

СТАР. 3

■ Прафесія ад Бога

Рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК:

«НЯПРАЎДА, ШТО МОЛАДЗЬ НЕ ХОЧА ІСЦІ Ў ПЕДАГОГІКУ...»

Фота Яўгена ПЯВЕЦКАГА.

22 чэрвеня 1914 года імператар Мікалай II зацвердзіў каштарыс даходаў і выдаткаў, які пераўтварыў мару аб адкрыцці ў Мінску настаўніцкага інстытута ў рэальнасць. А 21 лістапада — роўна сто гадоў таму — адбылося афіцыйнае ўрачыстае адкрыццё Мінскага настаўніцкага інстытута, на якім прысутнічала ўсё кіраўніцтва Мінскай губерні. «Дваццатае стагоддзе нярэдка называюць... стагоддзем педагогікі. Сапраўды, ніколі педагагічная думка не працавала так інтэнсіўна, як цяпер, — сказаў падчас урачыстасці дырэктар інстытута Дзмітрый Сцяпура. — Ідзе сур'ёзны перагляд ранейшых сістэм, метадаў і прыёмаў навучання і выхавання, вызначаюцца новыя шляхі і плыні, ствараюцца новыя педагагічныя дысцыпліны».

Напярэдадні 100-гадовага юбілею Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка мы сустрэліся з рэктарам, прафесарам Аляксандрам ЖУКОМ, каб даведацца, наколькі істотна адрозніваюцца задачы, што стаялі перад педагогамі сто гадоў таму, і тымі, якія вырашаюцца сёння, чаму перад настаўнікам больш не знімаюць капялюш і як прыцягнуць на педагагічныя спецыяльнасці лепшых...

СТАР. 4

ФАРМІРАВАННЕ ЦЭЛАСНАЙ СІСТЭМЫ ЗАВЕРШАНА

АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ БУДЗЕ ПРАДАСТАЎЛЯЦЦА ДЗЯРЖСЛУЖАЧЫМ ВЫКЛЮЧНА НА ПЕРЫЯД ПРАЦОЎНЫХ АДНОСІН

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў пералік пасад дзяржслужачых, што даюць права на атрыманне арэнднага жылля. Пры гэтым такое жыллё будзе давацца выключна на перыяд працоўных (службовых) адносін. Прэзідэнт падпісаў адпаведны Указ № 535 аб мерах па рэалізацыі Указа ад 16 снежня 2013 года № 563 «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін», паведамляе БЕЛТА.

Указам № 563 вызначаны катэгорыі грамадзян, якія маюць першачарговае права на арэнднае жыллё рэспубліканскага і камунальнага жыллёвага фонду на перыяд працоўных (службовых) адносін. Да іх адносяцца суддзі, пракурорскія работнікі, а таксама дзяржаўныя службоўцы згодна з пералікам пасад, што даюць права на атрыманне арэнднага жылля, які вызначаецца Прэзідэнтам Беларусі. Гэты пералік зацверджаны Указам № 535.

Акрамя таго, Указам № 535 для жылых памяшканняў, якія прадастаўляюцца гэтай катэгорыі дзяржаўных служачых, вызначаецца норма расходавання сродкаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) 1 кв.м агульнай плошчы арэнднага жылля для дзяржслужачых (не павінна перавышаць Br8,5 млн у цэнах на 1 студзеня 2014 года з далейшай індэксацыяй па статыстычных індэксах кошту будаўніча-мантажных работ у межах нарматыўнага тэрміну будаўніцтва).

Вызначаецца таксама парадак разліку памеру платы за карыстанне арэндным жыллём, што прадастаўляецца дзяржаўным служачым. Памер платы будзе вызначацца ў адпаведнасці з Указам № 563 (з каэфіцыентамі ў залежнасці ад месца знаходжання жылога памяшкання і яго добраўпарадкавання), а таксама з прымяненнем паніжальных каэфіцыентаў, якія будуць вызначацца Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта Беларусі (рэспубліканскі жыллёвы фонд) або аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам (камунальны жыллёвы фонд) па ўзгадненні з урадам.

Па сваёй сутнасці Указ № 535 завяршае фарміраванне на ўзроўні актаў кіраўніка дзяржавы цэласнай сістэмы, накіраванай на прававое рэгуляванне пытанняў прадастаўлення і выкарыстання арэнднага жылля. Дакумент дае магчымасць у далейшым на планавай аснове ажыццявіць карэкціроўку Жыллёвага кодэкса, які з'яўляецца комплексным прававым актам у галіне жыллёвых адносін.

У сувязі з гэтым указам выключаюцца прававыя механізмы адчужэння сваім работнікам, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы работы (службы), жылых памяшканняў, замацаваных за дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі, паколькі такое жыллё падлягае ўключэнню ў склад арэнднага жылля ў поўным аб'ёме.

Дзяржаўным органам (па ўзгадненні з Дзяржкаммаёмасцю) даецца права прымаць рашэнні аб бязвыплатным набыцці жылых памяшканняў ва ўласнасць Рэспублікі Беларусь з камунальнай або прыватнай уласнасці.

Паўналетнія члены сям'і памерлага наймальніка службовага жылога памяшкання выключаюцца з ліку асоб, якія маюць права на атрыманне льготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў у сувязі з заключэннем з гэтай катэгорыяй грамадзян дагавораў найму арэнднага жылля на ўмовах, прадугледжаных Указам № 563.

■ Парламенцкі дзённік

ПАЛІТЫЧНАЯ ДАПАМОГА

Дэлегацыя ў Шры-Ланцы садзейнічае эканамічным сувязям паміж дзвюма краінамі

У аўторак, 18 лістапада, дэлегацыя Беларусі на чале са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам Андрэйчанкам сустрэлася з прэм'ер-міністрам Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспублікі Шры-Ланка Дысанаяка Джаяратне. На сустрэчы спікер беларускага парламента адзначыў, што «адна з мэт візіту — пошук новых магчымасцяў для пашырэння беларуска-ланкійскага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва». Уладзімір Андрэйчанка звярнуў увагу на тое, што ў склад парламенцкай дэлегацыі Беларусі ўвайшлі кіраўнікі і прадстаўнікі вядомых беларускіх кампаній.

Беларускі бок падкрэсліў наяўнасць палітычнай падтрымкі лідарамі Беларусі і Шры-Ланкі ўмацавання эканамічнага парадку дня беларуска-ланкійскага дыялогу. Старшыня Палаты прадстаўнікоў выказаўся за нарошчванне аб'ёмаў і дыверсіфікацыю таваразвароту, уключаючы стварэнне сумесных вытворчасцяў на тэрыторыі Шры-Ланкі. Ён звярнуў увагу на экспартны патэнцыял беларускай сельскагаспадарчай галіны, аграпрамысловага комплексу, навуковатэхналагічнай сферы, фармакалагічных прадпрыемстваў.

На сустрэчы з кіраўніком урада Шры-Ланкі ішла размова пра рэалізацыю прапановы па стварэнні ў гэтай краіне зборачнай вытворчасці беларускіх трактароў, абмяркоўвалася магчымасць забеспячэння выхаду беларускай грузавой і пасажырскай аўтатэхнікі на ланкійскі рынак, павелічэнне аб'ёмаў узаемадзеяння ў сферы адукацыі.

Прэм'ер-міністр Шры-Ланкі падтрымаў беларускія эканамічныя ініцыятывы і паведаміў, што разглядае Беларусь як пляцоўку для выхаду на еўрапейскі рынак і рынак ЕАЭС.

У той жа дзень Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся з членам парламента Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспублікі Шры-Ланка Рашанам Ранасінгхе і з міністрам замежных спраў гэтай краіны Джаміні Пейрысам.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

СТАЛІЦА ЎСІХ ПРАКОРМІЦЬ?

15 400 чалавек у Мінску не жадаюць працаваць і не займаюцца пошукам працы

На рынку працы сталіцы дэфіцыт працоўнай сілы пакідае свабоднымі каля 16 тысяч вакансій. Аб гэтым паведамілі ў Мінгарвыканкаме. У 2013 годзе гэты паказчык складаў каля 25 тысяч вакансій. Нягледзячы на зніжэнне ўзроўню беспрацоўя, праблема застаецца актуальнай. Каля 73% ад усіх вакансій складаюць рабочыя прафесіі, 12% — вакансіі некваліфікаванай працы. Таксама ёсць шэраг месцаў, якія не запаўняюцца на працягу доўгага часу.

І зноў да пытання аб дармаедстве

Сёння паняцце «дармаед» у нарматыўных актах Беларусі не адлюстравана і яшчэ толькі будзе распрацоўвацца ўрадам на заканадаўчым узроўні. Але, тым не менш, па словах **Таццяны КУДЗЕВІЧ, намесніка старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне,** Мінгарвыканкам мае звесткі аб вялікай колькасці беспрацоўных грамадзян. Каб выправіць сітуацыю, у сталіцы праводзяцца кірмашы вакансій. Таксама інфармацыю па працаўладкаванні можна атрымліваць у інтэрнэце праз рэсурсы Мінгарвыканкама. Па звестках балансу працоўных рэсурсаў за 2013 год, 79600 грамадзян не мелі статусу ў дачыненні да занятасці. 38 тысяч з іх — людзі, якія займаюцца актыўным пошукам працы, але не былі зарэгістраваны як беспрацоўныя. Да гэтай катэгорыі адносяцца грамадзяне, якія шукаюць працу не больш за два тыдні. Назваць іх дармаедамі нельга. Каля 26 тысяч чалавек адносяць сябе да хатніх гаспадынь і выхоўваюць дзяцей. Тры тысячы чалавек служаць ва ўзброеных сілах. Не жадаюць працаваць і не займаюцца пошукам 15 400 чалавек.

«Менавіта гэтую катэгорыю спрабуюць прыцягнуць да паслуг службаў занятасці. З пачатку года ў службу занятасці Мінска звярнулася каля 16 тысяч чалавек, а гэта значыць, што кожны месяц звяртаюцца каля 1600 чалавек. Да тысячы атрымліваюць статус беспрацоўных. Каля 800 грамадзян працаўладкоўваюцца, каля 10 арганізуюць прадпрымальніцкую справу. Да 200 чалавек удзельнічаюць у штомесячных грамадскіх работах і да 80 накіроўваюцца на навучанне па запатрабаваных на рынку працы прафесіях», — патлумачыла Таццяна Кудзевіч.

Сярэднямесячны аб'ём дапамогі па беспрацоўі малы — 110 тысяч рублёў. Пражыць на яго немагчыма. Але разам з тым, па словах Таццяны Кудзевіч, сёння ў горадзе створаны ўсе ўмовы рынку працы для хутчэйшага працаўладкавання.

Дапамагаем мігрантам

З-за вялікай колькасці вакансій на рынку працы не абыходзіцца і без прадастаўлення працоўных месцаў для замежных грамадзян.

«Ёсць такія вакансіі, якія не запаўняюцца працяглы час. Мы абавязкова вывучаем сітуацыю. Правяраем наяўнасць спецыялістаў, якія стаяць на ўліку ў службе занятасці, і толькі тады робім заключэнне аб магчымасці працаваць замежным грамадзянам. Перавага аддаецца нацыянальнай рабочай сіле», — падкрэсліла Таццяна Кудзевіч.

З пачатку года рынак працы Беларусі папоўніўся на 15 тысяч замежных грамадзян. 75% з іх былі размеркаваны на рабочыя прафесіі. У большасці выпадкаў гэта грамадзяне Кітая і Украіны. У цэлым на рынку працы прысутнічаюць рэзідэнты больш як 60 краін.

Па словах Таццяны Кудзевіч, камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама аказваў непасрэдную кансультацыйную дапамогу ў пошуку працы грамадзянам Украіны. З пачатку года больш за 700 чалавек звярнуліся ва ўпраўленне занятасці. У большасці выпадкаў гэта жыхары Данецкай і Луганскай абласцей. Іх накіроўвалі ў рэгіёны Беларусі з-за таго, што яны прыязджалі з сем'ямі, і ім, акрамя працаўладкавання, неабходна было жыллё сямейнага тыпу. У рэгіёнах ёсць вакансіі, дзе прадастаўляецца такое жыллё.

Эканоміка сталіцы расце

Сёлета забяспечваецца станоўчая дынаміка развіцця эканомікі Мінска. Аб'ём валавога рэгіянальнага прадукту за студзень—кастрычнік 2014-га сфарміраваўся на ўзроўні 150 трлн валавой дабаўленай вартасці і павялічыўся ў супастаўных умовах аналагічнага перыяду 2013 года да 101,2%. Эканамічны паказчык фарміруецца за кошт такіх галін гаспадаркі, як апрацоўчая прамысловасць, гандаль, аперацыі з нерухомасцю. ВРП Мінска фарміруе ВУП Беларусі на чвэрць, а таксама больш за 40% кансалідаванага бюджэту, каля 30% прамысловай вытворчасці, больш за 20% усіх інвестыцый. Сталіца прыцягвае 51% прамых замежных інвестыцый ад бюджэту рэспубліканскага значэння, што складае каля 773 млн долараў ад 1,5 млрд долараў усяго аб'ёму такіх інвестыцый. За дзевяць месяцаў 2014 года Мінск забяспечыў экспарт тавараў і паслуг на 4,9% больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Пашырэнне дыверсіфікацыі паставак экспартнай прадукцыі дазволіла накіраваць тавары ў 194 краіны свету. Асноўнымі рынкамі збыту традыцыйна застаюцца Расія, Украіна. Хутка растуць рынкі экспарту ў Туркменістан, Польшчу і Літву. Сумесна з украінскім і азербайджанскім рынкамі гэтыя перспектыўныя суб'екты складаюць пятую частку ўсяго экспарту сталіцы.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

■ Факт

ПЕРШЫ СНЕГ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

Фота БЕЛТА.

19 лістапада, г. Шчучын.

Филиал «ЦЕНТР БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ № 1

• Изолированное помещение (помещение склада с рампой)
с инв. номером 410/D-17243, общей площадью 2884,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, 1А-2 на земельном участке с кадастровым номером 420850010000010083 10, площадью 0,3789 га.

• Сооружение (пожарный резервуар)
с инв. номером 410/С-28180, общей площадью 34 кв.м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е на земельном участке с кадастровым номером 420850100001010312, площадью 0,7360 га.

• Капитальное строение (закрытая терраса для хранения велосипедов)
с инв. номером 410/С-22461, общей площадью 452,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е/1 на земельном участке с кадастровым номером 420850100001010312, площадью 0,7360 га.

• Капитальное строение (склад кирпичный)
с инв. номером 410/С-28181, общей площадью 814,8 кв.м, расположенное по адресу: г. Волковыск, ул. Комарова, 1Е/2 на земельном участке с кадастровым номером 420850100001010312, площадью 0,7360 га.

Начальная цена продажи 10 187 422 000 рублей с учетом НДС.
Шаг аукциона 509 371 100 рублей.
Размер задатка 305 622 660 рублей.

Правообладателем имущества является Гродненское областное потребительское общество.
Организатор торгов – Филиал «Центр Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника», г. Гродно, ул. Дзержинского, 40-17а.
Договор купли-продажи заключается не позднее 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.
Условия оплаты определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи.
Номер р/с Организатора торгов для перечисления задатка:
р/с 3012105618108 в бел. рублях в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-СберБанк», код 369, УНП 102353509.

Аукцион состоится 22 декабря 2014 г. в 11.00
по адресу: г. Гродно, ул. Дзержинского, 40-17а .
Срок подачи документов до 17 часов 19 декабря 2014 г.
по адресу: г. Гродно, ул. Дзержинского, 40-17а.
Доп. информация по тел.: **8(0152)74-41-36, 60-20-44**

УНП 590959404

■ Жыллё

ДОЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАГА БУДАЎНІЦТВА ПАВЯЛІЧЫЦЦА

— За апошнія гады аб'ём будаўніцтва індывідуальнага жылля ў Беларусі, як правіла, не ніжэйшы за 30% агульнага ўводу. Напрыклад, у 2012 годзе было 31,6%, у 2013-м — 36,6%. За 9 месяцаў бягучага года лічба складае 32,6%. Да канца года плануем выйсці на 36–37%, — паведаміў **Уладзімір ДАРАПІЕВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва.**

Згодна з зацверджанай праграмай жыллёвага будаўніцтва, на 2015 год прадугледжаны меншы аб'ём уводу індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва. Але гэтыя лічбы можна карэктаваць. Усё залежыць ад фінансавання: калі ў грамадзян будуць грошы, будзе дзяржпадтрымка — аб'ём індывідуальнага будаўніцтва будзе расці.

Канцэпцыяй дзяржаўнай жыллёвай палітыкі да 2016 года прадугледжана давесці долю індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва не менш як да 40% агульнага аб'ёму ўводу жылля ў эксплуатацыю. Гэта колькасны пасыл. Якасны — максімальна наблізіць умовы жыцця ў сядзібным жыллі ў сельскіх раёнах да гарадскіх.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ

■

АБАРАНІЦЬ СТАРЫХ АД СВАЯКОЎ

23 тысячы чалавек былі прыцягнуты сёлета да адміністрацыйнай адказнасці за абразы, наўмыснае прычыненне лёгкіх цялесных пашкоджанняў, дробнае хуліганства ў дачыненні да сваякоў. Сярод пацярпелых ёсць, безумоўна, і людзі сталага веку.

Паводле слоў кіраўніка офіса Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Ягора ЗАЙЦАВА, дрэннае абыходжанне з пажылымі можа прыводзіць да фізічных траўмаў і нават да інваліднасці, сур'ёзных псіхалагічных праблем, уключаючы дэпрэсію і суіцыд.

Сумеснае пражыванне, фінансавая залежнасць, псіхічныя расстройствы, алкагалізм — не толькі гэтыя суб'ектыўныя фактары спрыяюць сітуацыі. Колькасць людзей ва ўзросце пасля 60-ці стабільна павялічваецца ва ўсім свеце (з 542 млн у 1995 годзе да 1,2 млрд, згодна з прагнозамі, у 2025-м). У Беларусі колькасць насельніцтва ад 65 гадоў дасягае ўжо 14 працэнтаў (па спецыяльнай шкале ААН, насельніцтва лічыцца старым, калі вышэйзгаданая ўзроставая катэгорыя складае звыш 7 працэнтаў). Такім чынам, чакаецца, што колькасць выпадкаў дрэннага абыходжання са сталымі людзьмі будзе толькі нарастаць. Эксперты спасылаюцца на неабходнасць распрацоўкі нацыянальнай стратэгіі па папярэджванні жорсткага абыходжання з пажылымі, удасканаленні адпаведнага нагляду і арганізацыі дапамогі пацярпелым.

Ужо цяпер ахвяры жорсткага абыходжання могуць пазваніць на **«гарачую лінію» дапамогі ахвярам хатняга гвалту 8 801 100 8 801** (званок са стацыянарнага тэлефона бясплатны). Вопытныя спецыялісты падкажуць, як лепш паступіць у канкрэтнай сітуацыі. Калі ж ёсць пагроза жыццю, неабходна звярнуцца ў міліцыю.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ МАРШРУТка бяспекі

АДСТАВІЦЬ РАЗМОВЫ, ЗА ДАРОГАЙ САЧЫ!

З 20 па 29 лістапада ў Мінску пройдзе аперацыя «Аўтобус». Работнікі сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі ў яе рамках правераць гарадскі пасажырскі транспарт і маршрутныя таксі.

— Будзе ўзмоцнены кантроль за захаваннем кіроўцамі маршрутных транспартных сродкаў правіл дарожнага руху. У прыватнасці, дзяржінспектары правераць правамоцнасць пераабсталявання транспартных сродкаў, якія выконваюць перавозку пасажыраў, праверацьнеабходную дакументацыю і тэхнічны стан аўтобусаў. Апроч гэтага, міліцыянеры звернуць увагу на размовы кіроўцаў па мабільным тэлефоне, — распавяла «Звяздзе» **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.** — Для гэтага супрацоўнікі ДАІ правядуць рэйды з выкарыстаннем як аўтамабіляў аператыўнага прызначэння, так і транспартных сродкаў «цывільнай» афарбоўкі. Для фіксацыі парушэнняў будуць выкарыстоўвацца фота- і відэакамеры.

Па словах Таццяны Спадабаевай, нягледзячы на агульнае зніжэнне колькасці дарожна-транспартных здарэнняў, здзейсненых па віне кіроўцаў аўтобусаў і маршрутных транспартных сродкаў, колькасць парушэнняў з іх боку застаецца дастаткова высокай. Нярэдкія выпадкі незахавання правілаў перавозкі пасажыраў, размяшчэння аўтобусаў і маршрутак на праезнай частцы, а таксама перавышэнне хуткаснага рэжыму руху, праезду на забараняльны сігнал святлафора.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

МЕКСІКАНСКІЯ МУЧАЧАС ГУЧНА ПЛАЧУЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Першы тайм аказаўся скупым на сапраўды вострыя моманты. Мексіканцы быццам гулялі напаўсілы, а беларусы ніяк не маглі ўшчыльную падысці да воротаў Альфрэда Талаверы. Хаця тэрытарыяльная перавага ўсе першыя 45 хвілін была ў падапечных Андрэя Зыгмантовіча. У другім тайме галявую плаціну прарвала. Тое, што адбывалася на полі, больш нагадвала футбольныя дагонялкі. «Ацтэкі» забівалі — беларусы адыгрываліся... У нашых хлопцаў хапала момантаў, каб забіць яшчэ не адзін мяч, але атрымалася толькі аднойчы: пераможную кропку ў гэтай сустрэчы паставіў Павел Міхайчык.

Пасля паядынку аўтар аднаго з галоў Сяргей Кісляк паспрабаваў растлумачыць, чаму ў таварыскіх матчах наша каманда гуляе лепш, чым у афіцыйных: «Напэўна, таварыскія матчы так і трэба праводзіць. Каб ад гульні атрымлівалі задавальненне і футбалісты, і балельшчыкі. У афіцыйных матчах на каманду шмат чаго цісне, умешваецца момант псіхалогіі — усё ж ідзе ад галавы… Трэба навучыцца гэта пераадольваць. Проста хочацца, каб цяпер усе балельшчыкі аб'ядналіся і пачалі «хварэць» за зборную. А то ходзяць чуткі, што яна дрэнная. У нас добрая каманда і годныя гульцы… Вядома шкада, што год мы правалілі, не дамагліся нават мінімальнага выніку. Пра прычыны і вынікі падумаем у міжсезонне».

Адкрытым застаецца пытанне: хто будзе працаваць са зборнай у міжсезонне? Першай кандыдатурай на пасаду галоўнага трэнера з'яўляецца Аляксандр Хацкевіч. Яшчэ адзін магчымы варыянт — вядомы балгарскі спецыяліст Хрыста Стоічкаў, які, дарэчы, за матчам з мексіканцамі назіраў у кампаніі намесніка старшыні футбольнай федэрацыі Сяргея Сафар'яна.

Што датычыцца Андрэя Зыгмантовіча, то цяперашні трэнер беларускай зборнай цалкам разумее сваё становішча: «Пра свой лёс у зборнай не ведаю. Але, шчыра кажучы, думаю, знойдуць кагосьці. Скажу толькі, што любы трэнер, які акажацца на гэтым месцы, будзе адчуваць каласальны ціск. З боку прэсы, спецыялістаў… Гэта, можа быць, і правільна. Бо менавіта крытыка прымушае нас рухацца наперад».

У любым выпадку Андрэй Зыгмантовіч паказаў зусім іншы тып трэнера беларускай каманды. Незалежны эксперыментатар, які не баіцца адкрыта захапляцца іспанскай зборнай і, разам з тым, адкрыта абараняць сваіх падапечных. Прамалінейна, шчыра і сапраўды па-мужчынску.

Беларусь — Мексіка (3:2) — 0:1 Рауль Хіменэс (48), 1:1 Сяргей Кісляк (50), 1:2 Рауль Хіменэс (53), 2:2 Мікалай Сігневіч (55), 3:2 Павел Няхайчык (81).

Мігель ЭРЭРА, галоўны трэнер зборнай Мексікі:

— Мая каманда гуляла «раскідана», у абароне было занадта шмат памылак. Сапернік прымушаў нас памыляцца. Таму прыйшлося цяжка. Пасля кожнай гульні звычайна мы аналізуем дзеянні кожнага футбаліста. Так што трэба будзе гэта зрабіць. Калі мы гулялі ў Амстэрдаме з Галандыяй, зборная была настроена сур'ёзна. Сёння мы, мабыць, недаацанілі саперніка — адсюль і такі вынік, якім я, вядома, незадаволены. Атака згуляла лепш, а вось абарона сёння падвяла. У сваю чаргу, зборная Беларусі паказала добрую гульню і заслужыла перамогу. Віншую гаспадароў!

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Фота БЕЛТА.

■ Прыемная навіна

ЕДЗЕШ У КЛАЙПЕДУ? ЁСЦЬ ЗНІЖКА

Пасажырам цягнікоў у зносінах Мінск — Вільнюс прадастаўляецца зніжка ў 10 працэнтаў пры аплаце праезду чыгуначным транспартам у Клайпеду.

Такое стала магчымым дзякуючы двухбаковым дамоўленасцям паміж чыгуначнымі адміністрацыямі Беларусі і Літвы. Каб атрымаць вышэйназваную зніжку, пасажыру, які здзяйсняе паездку па маршруце Мінск — Вільнюс, неабходна захаваць свой білет, патлумачылі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі. Пры прад'яўленні яго ў касах Літоўскай чыгункі і аплаце праезду ў Клайпеду з перасадкай на станцыі Вільнюс і даецца зніжка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СТАРЫ ДОМ КУЛЬТУРЫ СТАЎ НОВЫМ

У Лагойску пасля капітальнага рамонту адкрыўся Дом культуры.

Справа ў тым, што гэтая ўстанова культуры ўзведзена ў 1957 годзе. Збудаванне ўяўляла сабой архітэктурную каштоўнасць і гарманічна спалучалася з агульным ансамблем Цэнтральнай плошчы. Таму бурыць яго не сталі, а правялі капітальны рамонт, на які затрацілі каля 19 млрд рублёў. Сродкі пайшлі на ўмацаванне апорных канструкцый і фасада, яго цеплавую мадэрнізацыю, унутранае аздабленне і агульнае добраўпарадкаванне. Цалкам абноўлены светлавая і гукавая сістэмы Дома культуры.

Будаўнічыя работы выканала МПМК –198 (кіраўнік — заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь Мікалай Гіль).

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

■ Ёсць нагода

Вялікае свята маленькага чалавека

Сёння адзначаецца Сусветны дзень дзіцяці. Дата была ўстаноўлена па рэкамендацыі Генеральнай асамблеі ААН амаль паўстагоддзя таму, у 1956 годзе. Праз тры гады ў гэты ж дзень была зацверджана «Дэкларацыя правоў дзіцяці», а 20 лістапада 1989 года — «Канвенцыя правоў дзіцяці», якую ва ўсім свеце называюць таксама Канстытуцыяй дзяцінства.

У Беларусі лічыць гэтае свята сваім можа як мінімум 1761 тысяча чалавек, або 18,6% ад агульнай колькасці насельніцтва. Менавіта столькі дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, пражывала ў краіне на 1 студзеня гэтага года.

Пры гэтым, зазначаюць спецыялісты, у нас назіраецца станоўчая тэндэнцыя росту нараджальнасці. Яе ўзровень павялічыўся з 9,4 на 1000 чалавек насельніцтва ў 2005 годзе да 12,5 — у 2013-м.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Памятная дошка ў гонар Вітольда Цэраскага

Памятная дошка ў гонар вядомага астранома, даследчыка, педагога і вучонага Вітольда Цэраскага адкрыта на будынку слуцкай гімназіі № 1.

Ураджэнец Слуцка, ён у 1867 годзе закончыў гэтую навучальную ўстанову. Член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук, прафесар, доктар астраноміі і геадэзіі, дырэктар астранамічнай абсерваторыі Маскоўскага ўніверсітэта з 1860 па 1916 гады, Вітольд Цэраскі першым прымяніў фатаграфію ў астраноміі, вызначыў бачную зоркавую велічыню Сонца. А таксама ажыццявіў эксперыменты па вызначэнні тэмпературы Сонца і ацаніў яе ніжнюю мяжу. У 1885 годзе наш зямляк адкрыў серабрыстыя воблакі.

Урачыстае мерапрыемства прадоўжылася ў гімназіі. Навучэнцы прадставілі свае даследаванні па тэме космасу, прэзентавалі работы Школьнай акадэміі навук і клуба юных фізікаў. Госці азнаёміліся з творчымі праектамі гімназістаў «Падарожжа ў космас» і «Слуцкі след у космасе».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

■ Ну і ну!

ГРОШЫ АДРАЗУ, БЕНЗІН — ЗА ГАРАЖАМІ

У Фрунзенскае РУУС сталіцы паступіла каля дзясятка заяў пра тое, як пацярпелых простым і няхітрым спосабам падмануў невядомы. Ён, спосаб, аказаўся яшчэ больш дзейсным, чым у вядомага Алі Бабаевіча з «Джэнтльменаў удачы», які разводзіў бензін самі памятаеце чым. Наш герой «разводзіў» адразу даверлівых грамадзян.

Справа адбывалася на аўтазапраўцы. Да кіроўцаў, што прыехалі туды, падыходзіў малады чалавек, які прадстаўляўся дальнабойшчыкам. Ён прапаноўваў заправіць аўтамашыну пры яго «пасрэдніцтве» — за палову кошту паліва. Узяўшы перадаплату, «дальнабойшчык» прызначаў «кліентам» сустрэчу — напрыклад, за гаражамі. Натуральна, той з кіроўцаў, хто пагаджаўся на здзелку, у дамоўленым месцы нікога не бачыў. І падобныя інцыдэнты з удзелам маладога чалавека былі зафіксаваны на некалькіх аўтазапраўчых станцыях сталіцы. Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Фрунзенскага РУУС сталіцы затрымалі падазраванага. Ім аказаўся 30-гадовы мінчанін, які нідзе не працуе, раней быў судзімы за махлярства і толькі паўгода таму вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі. Цяпер высвятляецца дачыненне грамадзяніна да аналагічных злачынстваў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

«НЯПРАЎДА, ШТО МОЛАДЗЬ НЕ ХОЧА ІСЦІ Ў ПЕДАГОГІКУ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— На сустрэчы з удзельнікамі тэматычнай змены «Ад захаплення да педагагічнай прафесіі» ў «Зубраняці» вы сказалі, што вобраз настаўніка XXI стагоддзя амаль спісаны з пераможцы сёлетняга конкурсу «Настаўнік года — 2014». Што вы мелі на ўвазе?

— Віктар Жук трапіў у школу невыпадкова і зрабіў свой выбар свядома, маючы ўжо багаты жыццёвы вопыт: за яго плячыма былі на той момант вучоба ў прафесійным ліцэі, работа на будоўлі і служба ў войску. Дарэчы, педагагічную адукацыю ён атрымліваў у нашым універсітэце завочна. На працягу дзесяці гадоў будучы настаўнік гісторыі ўдзельнічаў у раскопках (разам з вучонымі з Акадэміі навук), у рыцарскіх турнірах, гістарычных рэканструкцыях. У школу прыйшоў пасля заканчэння ўніверсітэта і, як ён сам прызнаўся, увайшоў у клас гісторыкам, а выйшаў — настаўнікам. Ён па-сапраўднаму паглыблены ў сферу, якой займаецца. А тое, што ляжыць за межамі падручніка, як вядома, заўсёды выклікае ў дзяцей інтарэс. Чым вышэйшая эрудыцыя чалавека, тым ён больш цікавы ў зносінах. Раней школа была практычна адзінай крыніцай ведаў, цяпер жа гэта толькі адна са шматлікіх крыніц. Таму калі настаўнік (нават пры ўмове, што свой прадмет ён ведае дасканала) не арыентуецца ў сучасным жыцці, то рызыкуе страціць аўтарытэт у сваіх вучняў.

Сучасныя дзеці з камп'ютарам на «ты». І ў гэтым плане пераможца конкурсу «Настаўнік года» ад іх не адстае. Ён можа пракансультаваць сваіх вучняў у сацыяльных сетках, даць ім заданне...

— Аляксандр Іванавіч, вы ўзначалілі ўніверсітэт незадоўга да старту ўступных іспытаў, аднак паспелі правесці магутную рэкламную кампанію, у выніку чаго былі запоўнены ўсе бюджэтныя месцы. Прызнайцеся, як вам удалося завабіць да сябе такую вялікую колькасць медалістаў?

— Мы не проста запоўнілі бюджэтныя месцы. Калі параўнаць з мінулым годам, то па большасці спецыяльнасцяў прахадныя балы павялічыліся на 25—70 пунктаў. Прыемна, што больш за чвэрць першакурснікаў — гэта выпускнікі ліцэяў і гімназій. Да таго ж да нас паступілі 100 медалістаў і выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў з дыпломам з адзнакай. У пяць разоў больш, чым летась! Па-мойму, гэта найлепшы адказ скептыкам, якія сумняваліся, што дазвол медалістам паступаць без уступных іспытаў спрацуе. Не буду ўтойваць, што 300 медалістаў атрымалі асабістыя запрашэнні ад рэктара падаваць свае дакументы ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт. Мы паслалі ім сігнал: у педуніверсітэце вас будуць рады бачыць. Да таго ж напярэдадні прыёмнай кампаніі нашы студэнты актыўна працавалі ў сацыяльных сетках, кансультавалі патэнцыяльных абітурыентаў...

«Чаму ж настаўнік — соль зямлі? Напэўна, таму, што здаўна людзі цанілі соль за адменныя якасці доўга захоўваць свежымі прадукты. Так і настаўнікі зберагаюць душы ад духоўнай гнілі. Як ежа без солі прэсная, так і сэрцы людзей застаюцца пустымі без «настаўніцкага» зерня».

(сачыненне вучаніцы 11 класа гімназіі № 1 г. Жлобіна Ірыны КРАЎЧАНКА)

— Настаўнікам трэба нарадзіцца або ім можна стаць, атрымаўшы педагагічную спецыяльнасць?

— Педагогіка — прафесія не для кожнага, і я ўпэўнены, што настаўнік «пачынаецца» не з педуніверсітэта — «гадаваць» будучых педагогаў трэба яшчэ ў школе. Трэба шукаць дзяцей з педагагічнымі схільнасцямі, з жаданнем вучыць іншых, з лідарскімі задаткамі, з уменнем камунікаваць і выстройваць зносіны з іншымі. Матывацыя да прафесіі — гэта, напэўна, самае важнае.

«Я ведаю адзін помнік, каля якога заўсёды ў Дзень настаўніка ляжыць шыкоўны букет у выглядзе сэрца з чырвоных руж. Гэта помнік на звычайных сельскіх могілках, помнік маёй бабулі. Наш букет у Дзень настаўніка ніколі не бывае першым, хоць мы і прыходзім зранку. Першым сваю настаўніцу віншуе яе вучань Міця, як звала яго бабуля. Яму ўжо за шэсцьдзесят, ён бізнесмен, заўсёды неверагодна сур'ёзны і неверагодна заняты. Але кожны год знаходзіць час, каб вярнуць сваёй першай настаўніцы кавалачак сэрца, што калісьці атрымаў».

(сачыненне вучаніцы 10 класа Мар'інагорскай гімназіі Аліны БАКУНОВІЧ)

Лічу, што ўсім вышэйшым навучальным установам, дзе ёсць педагагічныя спецыяльнасці, трэба спускацца з нябёсаў на зямлю і ісці ў школы. Прычым пачынаць прафарыентацыйную работу неабходна з сярэдніх класаў, бо ў выпускным класе агітаваць за прафесію педагога ўжо позна. Трэба адраджаць педагагічныя класы і ствараць педагагічныя гімназіі — хоць бы па адной у кожнай вобласці. І даваць іх выпускнікам прэферэнцыі пры паступленні на педспецыяльнасці...

Мы распрацавалі цэлы пакет прапаноў для раённых аддзелаў адукацыі, пачынаючы з арганізацыі работы школ юных, школьных навуковых таварыстваў і заканчваючы дапамогай педагогам у падрыхтоўцы да алімпіяд і ЦТ. Аднаму ўніверсітэту без дапамогі школы не адшукаць здольных да педагогікі дзяцей. Менавіта настаўнікі павінны разгледзець у сваім вучні будучага калегу і даць яму бласлаўленне на вучобу...

— А як вы патлумачыце наступны парадокс: усе бацькі хочуць, каб іх дзіця вучыў Педагог з вялікай літары, але не хочуць, каб іх дзеці паступалі на педагагічную спецыяльнасць?

— Спадзяюся, гэта часовая з'ява. Сёлета амаль трэць першакурснікаў БДПУ — выпускнікі ўстаноў адукацыі Мінскай вобласці. А з 240 сталічных школ на дзённую бюджэтную форму навучання паступілі ўсяго 109 чалавек. Давайце паспрабуем паглядзець на гэтую сітуацыю з іншага боку. Калі з кожнай школы (а іх у нашай краіне больш як 3 тысячы) да нас прыйдзе ўсяго па адным таленавітым вучні, то ўвесь прыём будзе якасным. Няпраўда, што моладзь зусім не жадае ісці ў педагогіку. Гэта міф, які мы павінны разбурыць. Трэба толькі ўбачыць гэтых дзяцей і правільна іх скіраваць. А бацькі не павінны перашкаджаць сваім дзецям у ажыццяўленні іх прафесійнага выбару.

Сёння прывабнасць нашай прафесіі знізілася ў немалой ступені з-за невысокіх заробкаў. Але ж не ўсё вымяраецца грашыма: добры спецыяліст ведае сабе цану і заўсёды выклікае павагу як у сваіх вучняў, так і ў іх бацькоў. Дарэчы, БДПУ сумесна з Міністэрствам адукацыі працуе над праграмай сацыяльнай падтрымкі настаўнікаў — ільготным крэдытаваннем, зніжкамі на інтэрнэт і мабільную сувязь, на білеты пры наведванні тэатраў і музеяў. Мы зробім усё для таго, каб настаўнік адчуваў сябе ўпэўнена і прафесія педагога зноў стала прэстыжнай.

— Ваша мара — стварэнне ў краіне педагагічных гімназій. Адкрыццё педагагічных класаў у 20-й сталічнай гімназіі — толькі першая ластаўка?

— Вельмі на гэта спадзяёмся. На базе 20-й мінскай гімназіі былі створаны чатыры педагагічныя класы фізіка-матэматычнага і філалагічнага профіляў для 104 вучняў. На працягу двух гадоў побач з настаўнікамі гімназіі заўсёды будуць прысутнічаць і выкладчыкі БДПУ. Яны будуць выкладаць гімназістам асобныя тэмы на паглыбленым узроўні, праводзіць факультатыўныя заняткі, рыхтаваць гімназістаў да ўдзелу ў алімпіядах, турнірах, конкурсах навукова-даследчых работ. Акрамя таго, выкладчыкі ўніверсітэта пазнаёмяць гімназістаў з асновамі педагогікі і псіхалогіі, дапамогуць ім выявіць і развіць іх здольнасці і, бадай што самае галоўнае — абудзіць інтарэс да прафесіі педагога. Важна своечасова зразумець — твая прафесія альбо не твая...

Акрамя таго, у нас ужо прайшла ўстаноўчая сесія вочна-завочнай педагагічнай гімназіі. Гэта новая структура, створаная на базе БДПУ. Яе работа разлічана на старшакласнікаў, зацікаўленых у атрыманні прафесіі педагога. Вочная форма прадугледжвае лекцыйныя заняткі ва ўніверсітэце, якія праводзяцца ў канікулярны час. Выкладчыкі ўніверсітэта будуць чытаць лекцыі па педагогіцы, псіхалогіі, сацыяльнай рабоце, раскажуць пра прамудрасці і нюансы педагагічнай прафесіі. А завочная (дыстанцыйная форма) навучання азначае самастойную работу з кантролем за поспехамі навучэнцаў з боку выкладчыкаў. А наступны наш крок — адкрыццё педагагічных гімназій у кожным абласным цэнтры.

— Сацыялагічныя апытанні, праведзеныя ў Расіі, сведчаць, што толькі 10 працэнтаў выпускнікоў педагагічных ВНУ гатовы працаваць у школе. Нашы суседзі збіраюцца ўвесці так званае партфоліа для маладых настаўнікаў, якое будзе ўключаць знешнюю ацэнку з боку выкладчыкаў навучальных установ, дзе студэнт праходзіў практыку. Мяркуецца, што гэтае новаўвядзенне прымусіць студэнтаў больш адказна ставіцца да праходжання педагагічнай практыкі... А як вы ацэньваеце эфектыўнасць практычнага складніка падрыхтоўкі студэнтаў у вашым універсітэце?

— Калі толькі 10% студэнтаў нацэлены на работу ў школе, то ўжо ніякае партфоліа не выратуе. Гэта значыць, што дзяржаўныя сродкі на падрыхтоўку будучых спецыялістаў былі змарнаваны. Упэўнены, што больш якасны адбор павінен быць яшчэ на ўваходзе ў педуніверсітэт. А для гэтага патрабуецца ранняя прафарыентацыя, яшчэ за школьнай партай...

Што тычыцца праходжання практыкі, то ў адукацыйных стандартах апошняга пакалення доля практыкі павялічылася з 10 да 15%. А з наступнага года мы распачынаем эксперымент на трох факультэтах (фізічным, матэматычным і прыродазнаўчым): практыка ў студэнтаў будзе распачынацца не з трэцяга курса, як цяпер, а з другога. Вучэбны план будзе складзены так, што адзін дзень на тыдзень будзе вольны ад заняткаў ва ўніверсітэце, і студэнты будуць праводзіць яго ў школе: наведваць урокі вопытных настаўнікаў, дапамагаць ім у праверцы хатніх заданняў, у падрыхтоўцы сродкаў навучання, удзельнічаць у пазакласнай рабоце, у тым ліку і ў шосты школьны дзень. Адным словам, паглыбяцца ў штодзённую школьную рэчаіснасць. Нават думаем ствараць міні-групы з навучэнцаў па тры-пяць чалавек, якія будуць рэалізоўваць падчас практыкі вучэбна-даследчыцкія праекты. Іх вынікам павінны стаць канкрэтныя практычныя распрацоўкі, якія могуць укараняцца ў вучэбны працэс ці ў выхаваўчую работу. Затым праекты могуць легчы ў аснову курсавых ці дыпломных работ і нават магістарскай дысертацыі. Галоўнае, што яны не будуць пыліцца на паліцах.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

На занятках у кабінеце хіміі. Старшы выкладчык БДПУ Вікторыя АГАРОДНІК са студэнтамі трэцяга курса Мікітам ЛЯЎКОВІЧАМ, Уладзімірам КЛЕЎЖЫЦАМ, Марынай ПАДАЛЯКІНАЙ.

Марым таксама, каб нам аддалі дзіцячы садок, які адкрыўся нядаўна ў Студэнцкай вёсцы, дзе выхавальнікамі і псіхолагамі змаглі бы працаваць студэнты нашага ўніверсітэта.

— Напярэдадні юбілею ва ўніверсітэце было праведзена шмат цікавых мерапрыемстваў, напрыклад, конкурсы эсэ і відэаролікаў пра настаўнікаў. Ці парадавалі вас вынікі?

— На мой погляд, школьнікі зрабілі для папулярызацыі прафесіі педагога нашмат больш, чым беларускія кінарэжысёры, сцэнарысты і журналісты. Не магу прыгадаць нашумелага кінафільма, буйной мастацкай выставы, серыі артыкулаў у цэнтральнай прэсе або шырока разрэкламаванага ток-шоу, дзе б галоўным героем стаў менавіта настаўнік. Напярэдадні юбілею мы выпусцілі зборнік іх лепшых сачыненняў і зборнік відэаролікаў. Спадзяёмся запусціць «нарэзку» з лепшых роліка ў на адным з беларускіх тэлеканалаў... А скульптурная кампазіцыя «Настаўніца першая мая», устаноўленая на ўваходзе ва ўніверсітэт напярэдадні Дня настаўніка, не проста сустракае штодня нашых выкладчыкаў і студэнтаў, яна стала яшчэ і турыстычным аб'ектам. На галоўнай плошчы краіны пастаянна праходзяць экскурсіі, і сфатаграфавацца з настаўніцай стала ў турыстаў ужо добрай традыцыяй.

— А якім вы бачыце ўніверсітэт, скажам, гадоў праз 50? Ці зменяцца задачы, якія будуць стаяць перад педагогам?

— Сёння мы замахнуліся на новы віток у развіцці ўніверсітэта, прычым я маю на ўвазе не толькі стварэнне сучаснага адукацыйнага асяроддзя, перааснашчэнне матэрыяльна-тэхнічнай і вучэбна-лабараторнай базы, выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій. Нам бы хацелася, каб тут нарадзіўся і новы дух, каб нашы выпускнікі былі запраграмаваны на поспех. Мы хочам фарміраваць сучаснага настаўніка, з захаваннем лепшых традыцый педагагічнай адукацыі і адначасова самадастатковага, упэўненага ў сабе прафесіянала. Каб ён разумеў сучасных дзяцей, а яны разумелі яго і бачылі, што ён «у тэме».

«Усё ў школе будучыні будзе не так, як сёння. Усё па-іншаму! Я ўяўляю сабе прасторныя светлыя калідоры і класы. Гэта не зусім класы, а віртуальная прастора. Тут я магу аказацца ў любым месцы і ў любым часе, сустрэцца з філосафамі мінулага і паслухаць іх урокі, пагутарыць з Ньютанам ці Пушкіным, пасядзець на канцэрце Моцарта... Тут ёсць спецыяльныя зоны, дзе настаўнік і яго вучні могуць адпачыць на беразе віртуальнай рэчкі, паганяць мяч на зялёным лужку, паглядзець на ландшафты малавывучанай планеты. І побач з сабой я бачу Настаўніка, які ўсё ведае і ўмее, ласкавага і добрага — сапраўднага Настаўніка будучыні».

(сачыненне вучаніцы 10 класа гімназіі №1 г. Жлобіна Уладзіславы АНІСКОВІЧ)

Місія педагога не змяняецца. Навучыцца абуджаць цікавасць да свайго прадмета і да навучання ўвогуле — адна з галоўных яго задач. Безумоўна, веды сучаснага настаўніка не павінны саступаць ведам яго папярэднікаў. Але на першае месца выходзіць яго ўменне наладжваць зносіны з вучнямі, а гэта значыць, камунікатыўныя здольнасці, уменне пастаянна вучыцца і вучыць гэтаму сваіх вучняў. Настаўнік перастае быць настаўнікам, калі перастае быць вучнем.

Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

20 ЛІСТАПАДА 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 22 (15757)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года



Імёны

Аляксей БУРНОСЕНКА:

«Мае адносіны з агнём ужо не рамантычныя»

Ён утаймоўвае розныя стыхіі і пры гэтым усё паспявае. Вядомы як музыкант, акцёр, факір, хаця некалі вучыўся на інжынера. Сёння Аляксей Бурносенка ладзіць агнявыя шоу, іграе на сямі інструментах (і мае ўласную калекцыю дрымбаў, якая налічвае паўсотні адзінак), узначальвае «Шэльмаўскі тэатр ДыГрыза» і выхоўвае сына. Як ён сам прызнаўся, жыццё набыло іншыя прыярытэты, давялося адмовіцца ад ранейшай прагі авантурызму і свабоды. Аднак Аляксей па-ранейшаму не збаўляе «хуткасцяў» і застаецца верным сабе. Мы паспрабавалі высветліць, як праца над сабой можа змяніць жыццё, чаго не можа дазволіць сабе наш герой і на што яму не шкада вялікіх грошай...

— Акрамя тэатральнай працы, у мяне ёсць яшчэ і офісная. (Мы сустракаемся ў Парку высокіх тэхналогій. — **Аўт.**) Тут я тэсціроўшчык праграмнага забеспячэння і, разам з тым, трэнер па майстэрстве публічных выступленняў для IT-спецыялістаў. А па вечарах і па выхадных у мяне тэатр. Вяду такое вось падвойнае жыццё...

— Чым абумоўлены такі інтарэс да тэмы публічных выступленняў? Можа, быў у дзяцінстве перыяд няўпэўненасці ў сабе?

— Тады я быў вельмі сціплым. І пасля дзіцячых і школьных гадоў хацеў быць з публікай, а не пад яе «прыгнётам». Стаў працаваць у гэтым кірунку... Я быў тыповым вучнем-выдатнікам, якога не любілі ў вясковай школе. Там усё проста: выдатнік — гэта выскачка. Але недзе ў сёмым класе мае аднакласнікі зразумелі, што ў мяне можна спісваць, мяне сталі паважаць і берагчы. Сёння вучню кшталту мяне было б прасцей, бо цяпер на першым месцы поспех. А ў тыя часы больш «крутымі» былі тыя, хто меў мускулы і мог пастаяць за сябе ў бойцы.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Бачыць мэту

ЦІ МОЖНА «КУПІЦЬ» РАЗМЕРКАВАННЕ?

Платная адукацыя не гарантуе першага працоўнага месца

Маладыя людзі ведаюць, што знайсці першае працоўнае месца бывае не так проста, таму многія «платнікі» хацелі б атрымаць яго праз размеркаванне. На думку Ігара Бузоўскага, першага сакратара Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, абмеркаванне гэтай з'явы можа перайсці зусім у іншую плоскасць. Падчас сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ Ігар БУЗОЎСКІ закрануў розныя пытанні — ад вынікаў агульнарэспубліканскага праекта «Адкрыты дыялог» да супрацоўніцтва БРСМ з замежнымі ініцыятывамі і будучыні праекта «100 ідэй для Беларусі».

НА МЕСЦА БЮДЖЭТНІКА — «ПЛАТНІК»?

— Падчас «Адкрытага дыялогу» да нас прыходзілі людзі з рознымі пазіцыямі і рознымі меркаваннямі, — заўважыў кіраўнік БРСМ. — У прыватнасці, у Гродзенскай вобласці хлопец, які навучаецца на платнай аснове, задаў пытанне аб размеркаванні. Малады чалавек хоча яго атрымаць, але ў тую арганізацыю, дзе б яму хацелася працаваць пасля заканчэння ўніверсітэта, размеркавалі «бюджэтніка». Апошні, дарэчы, туды ехаць не хоча... Тэма размеркавання зараз хвалюе вельмі многіх. «Бюджэтнікі» яго баяцца, а «платнікі», як вядома, размеркавання не атрымліваюць. Часта знайсці працу спецыялісту з дыпломам, але без прафесійнага вопыту вельмі праблематычна...

— Дык вось, мы пачулі, што студэнт-«платнік» задумваецца над тым, каб атрымаць размеркаванне.

На думку Ігара Бузоўскага, калі на месца «бюджэтніка» хоча ехаць «платнік», а «бюджэтнік», у сваю чаргу, не жадае там працаваць, то можна пайсці насустрач людзям.

КАНТАКТЫ З «ЛЮДЗЬМІ СПРАВЫ»

Сёлета БРСМ акрэдытаваўся пры Еўрапейскай валанцёрскай службе і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Гэта дае магчымасць арганізацыі ўдзельнічаць у цікавых замежных праектах і самой ініцыяваць правядзенне новых мерапрыемстваў міжнароднага характару.

— У Еўрапейскім саюзе мы шукалі людзей справы, людзей, якія не займаюцца палітыканствам і балбатнёй у дачыненні да «правільнасці або няправільнасці» дзейнасці БРСМ і стратэгіі, якой мы прытрымліваемся, — адзначыў Ігар Бузоўскі. — Мы знайшлі тых, з кім у нас агульныя інтарэсы, напрыклад, у арганізацыі работы па сацыяльных праектах.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Будзем знаёмыя

МІКІТАЎ ДАР,

або «ШЛЯХАМ ВОІНА» — НАСУПЕРАК ПЕРАШКОДАМ!

З Мікітам Трафімовічам мы знаёмыя не першы год. Калі ўбачыліся ўпершыню, ён актыўна цытаваў Іосіфа Бродскага і іншых вялікіх. Але нават гэта не здзіўляла так, як яго добрае і сонечнае стаўленне да суразмоўцы. Не думайце, што Мікіта — герой без адмоўных рыс. Не. Ён, хутчэй, воін, які штодня імкнецца пераадольваць перашкоды і адчуваць сябе шчаслівым.

У свае 26 гадоў Мікіта паспеў папрацаваць калумністам, маркетынгавым кансультантам і капірайтарам, адшукаць сваю Музу, сапраўдных сяброў і ўладкаваць асабістае жыццё. Неўзабаве павінен выйсці першы зборнік яго вершаў. Яшчэ сёлета на спаборніцтве прамоўцаў «TEDx Minsk» Мікіта атрымаў прыз глядацкіх сімпатый. Пра эфемернасць нашых самаабмежаванняў і прагу да сапраўднага жыцця распавядае сам Мікіта.

ТЛУМАЧЫЎ, ЯК ЯГО... ВУЧЫЦЬ

— Ва ўніверсітэце, куды я паступаў, адкрыта казалі: «Лепш табе не вучыцца тут», маючы на ўвазе «Ты не зможаш». Маўляў, лепш ідзі на гісторыка. Але гэта было не ад злосці. Людзі не ведалі, што са мной рабіць, — распавядае Мікіта.

У свой час ён паступіў на дзённае навучанне на факультэт філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Цэнтралізаванае тэсціраванне хлопцу нельга было здаваць па стане здароўя, таму ў Мікіты і яшчэ двух чалавек прымалі тры ўнутраныя экзамены. Іх ён здаў добра і трапіў на бюджэтнае навучанне.

— Раней было такое паняцце, як «індывідуальны план навучання» (не ведаю, як цяпер). Я дамаўляўся пра форму працы з кожным выкладчыкам асобна — рэферат, тэст, эсэ. Калі што, мае аднагрупнікі перадавалі мне работы, запісвалі лекцыі на дыктафон ці сканіравалі канспекты. А калі я быў патрэбны выкладчыку, прасіў папярэджваць мяне і прыязджаў да яго ў інстытут. Гэтыя пытанні вырашаліся праз электронную пошту ці тэлефон. Штодзённа на заняткі я не хадзіў, — прыгадвае суразмоўца.

Часам Мікіту даводзілася тлумачыць выкладчыкам, як з ім быць. Яны, убачыўшы хлопца ўпершыню, самі пыталіся: «А як жа вас вучыць?». «Я заўжды даваў час на роздум і чакаў. Пасля навучыўся адразу тлумачыць, што для мяне ёсць пэўныя абмежаванні. Напрыклад, я не магу «падскочыць», каб забраць працу». Хлопцу трэба было дамаўляцца загадзя, за некалькі дзён, каб яго падвезлі куды трэба.

— Былі таксама прапановы прымаць залік па тэлефоне. Але я адмаўляўся. Мне хапіла надомнага навучання ў школе і адчування, што цябе ніхто не ведае. Калі я атрымліваў залаты медаль, толькі адзіны чалавек прыгадаў мяне і падышоў паціснуць руку... Вось таму я вырашыў усе залікі і экзамены здаваць разам са сваёй групай.

Я не гнаўся за высокімі адзнакамі. Вучыўся сярэдне. Разумеў, што ў прыярытэце павінна быць здароўе. Памятаю, быў выпадак. Я здаваў экзамен па сацыялогіі. Адказаў на пытанні на 9 балаў. Звычайна за тое, што студэнт не наведвае заняткі, адзнаку зніжаюць на бал. А мне выкладчык з той самай прычыны павысіла яе і паставіла «10», — гаворыць Мікіта.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
20 11 2014 г.

Ведай нашых!

У ПРАГРАМІСТАЎ ДОБРАЯ ЗАЯЎКА НА ПЕРАМОГУ

8 беларускіх каманд выйшлі ў паўфінал 17-га камандnага першынства свету па праграмаванні сярод студэнтаў

Чвэрцьфінальныя спаборніцтвы прайшлі на базе Белдзяржуніверсітэта. Усяго ўдзельнікамі інтэлектуальных спаборніцтваў сталі каля 180 студэнтаў, якія прадстаўлялі 58 каманд ВНУ Беларусі, Эстоніі, Латвіі, Літвы і Калінінграда. Шэсць зборных выступалі за факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Белдзяржуніверсітэта, і 3 зборныя прадстаўлялі факультэт камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР.

Усяго журы падрыхтавала для ўдзельнікаў 13 задач, якія трэба было рашыць за 5 гадзін, але з адной задачай не справілася ніводная каманда. Абыякавых сярод балельшчыкаў не было: не толькі студэнты, але і выкладчыкі на перапынках спяшаліся ў фае, каб убачыць змяненні ў ходзе спаборніцтваў, якія фіксаваліся ў табліцы. Кожная каманда ў любы момант магла паглядзець, на якім месцы яна зараз находзіцца і колькі задач рашылі іх сапернікі. Таксама гэта табліца можа падказаць, якую з задач рашаць наступнай, бо з лёгкімі задачамі спраўляюцца ўсе.

Пры правільным рашэнні камандзе налічваецца штрафны час, роўны колькасці хвілін, якія прайшлі ад пачатку спаборніцтваў да моманту здачы задачы, плюс дадатковыя 20 хвілін — за кожную няўдалую спробу здачы. Пры роўнай колькасці вырашаных задач перамагае каманда з найменшым штрафным часам. І ўсё ж такі інтрыга захоўваецца да самага канца: справа ў тым, што за гадзіну да заканчэння спаборніцтваў табліца «замарожваецца». І пасля гэтага толькі сама каманда ведае, колькі задач яна паспела рашыць. Напрыклад, сюрпрыз чакаў студэнтаў БДУІР, паколькі каманда Belarusian SUIR#2 паспела пасля «замарожвання» вынікаў паспяхова здаць яшчэ дзве задачы і абагнала каманду Belarusian SUIR#1, якая лідзіравала на працягу спаборніцтваў.

А лепшымі ў чвэрцьфінале сталі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ — чацвёртакурснік Канстанцін Сокал і другакурснікі Аляксей Паліевіц і Павел Шафцялевіч. На другім месцы аказаліся таксама студэнты ФПМІ: пяцікурснікі Аляксей Колесаў, Яўген Грыцкевіч і чацвёртакурснік Аляксандр Некрашэвіч. Трэцяе месца заваявала зборная Латвійскага ўніверсітэта. Усе тры каманды рашылі па 11 задач, а месцы паміж імі разыгрываліся толькі па часе, які яны выдаткавалі на іх рашэнне.

У паўфінал прайшлі 13 каманд: па дзве каманды ад БДУ, Латвійскага ўніверсітэта, БДУІР, Балтыйскага федэральнага ўніверсітэта імя Канта і па адной — ад Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, БДЭУ, Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Тартускага ўніверсітэта і Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Паўфінал камандnага чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў адбудзецца ў пачатку снежня ў Санкт-Пецярбургу.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Час маладых: адкрыты дыялог

ПРЫЙСЦІ І... ЗАСТАЦЦА

У рамках адкрытага дыялогу «Моладзь Беларусі: традыцыі і будучыня», які абвясціла грамадскае аб'яднанне «БРСМ», «Чырвонка» працягвае змяшчаць меркаванні маладых людзей з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Плануецца, што ўсе агучаныя ідэі, канцэпцыі, праграмы, стратэгіі і інавацыі ў сферы маладзёжнай палітыкі будуць акумуляваны для ўнясення прапаноў у рэспубліканскія органы дзяржаўнай улады. Тэмы, пытанні, праблемы і прапановы, узнятыя падчас правядзення адкрытага дыялогу, стануць асновай для вызначэння новага вектара ў рабоце з моладдзю — як з боку грамадскіх фарміраванняў, так і з боку органаў дзяржаўнай улады.

Як утрымаць крэатыўную і перспектыўную моладзь у навуцы?

Аляксей ТРУХАНАЎ, намеснік старшыні Савета маладых навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук, кандыдат фізіка-матэматычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік НПЦ Нацыянальнай акадэміі навук па матэрыялазнаўстве:

— Апошнім часам усё часцей у нашай краіне сталі задумвацца пра ролю моладзі ў навуцы. Гэта не можа застацца незаўважаным маладымі людзьмі, якія хацелі б звязаць сваё жыццё з навукай. У Беларусі рэалізуецца Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця на 2011-2015 гады, асноўным «рэсурсам» якой з'яўляюцца тыя ж маладыя вучоныя. Мяркую, што нікога не трэба пераконваць у тым, што творчы патэнцыял адукаванай моладзі, якая часта глядзіць на праблему нестандартна, можа адыграць у паспяховай рэалізацыі гэтай праграмы вырашальную ролю.Таму вельмі важна, каб маладыя людзі пасля атрымання вышэйшай адукацыі не проста ішлі ў навуку, але і заставаліся ў ёй.

Аднак сёння ёсць праблемы, якія стрымліваюць павелічэнне колькасці моладзі ў навуцы і знікаюць працэнт тых, хто ў навуцы «затрымаўся». Можна вылучыць асноўныя пункты, выкананне якіх, на мой погляд, дапамагло б вырашыць гэтыя праблемы. Па-першае, знаёмства з навукай павінна пачынацца яшчэ за школьнай партай — гэта значыць, трэба займацца папулярызацыяй навукі сярод школьнікаў. Трэба наладзіць цесныя сувязі

«У моладзі, занятай у акадэмічнай і галіновай навуцы, павінна быць магчымасць бесперапыннага павышэння прафесійнага ўзроўню як у нашай краіне, так і на базе замежных навуковых цэнтраў».

паміж навуковымі цэнтрамі і студэнтамі падчас іх навучання, а таксама актывізаваць гарызантальныя сувязі паміж самімі маладымі навукоўцамі. У моладзі, занятай у акадэмічнай і галіновай навуцы, павінна быць магчымасць бесперапыннага павышэння прафесійнага ўзроўню як у нашай краіне, так і на базе замежных навуковых цэнтраў. Але, самае галоўнае, каб кіраўнікі на месцах заўважалі і падтрымлівалі маладых навукоўцаў, у якіх ёсць моцная ўнутраная матывацыя для таго, каб ісці ў навуку і развівацца.

Для ахвотных развівацца ў навуцы трэба ствараць матэрыяльныя і сацыяльныя выгоды, аднак да выканання апошняга пункта трэба падыходзіць не фармальна, а з розумам. Дзяржаўная падтрымка павінна аказвацца той творчай моладзі, якая або ўжо праявіла сябе, або мае перспектывы і жаданне праявіць сябе на ніве айчыннай навукі і даказвае гэта сваёй штодзённай «ударнай» працай. На жаль, назіраецца трывожная тэндэнцыя, калі маладыя «вучоныя» трапляюць у навуковыя калектывы выпадкова, зусім не ўяўляючы сябе ў навуковай дзейнасці і загадзя ведаючы, што пасля заканчэння двух гадоў вузаўскага размеркавання больш з навукай іх нічога звязваць не будзе. Безумоўна, гэта вельмі «зручна» — атрымаць на размеркаванні «білет у навуку»: тут табе і магчымасць атрымаць працоўнае месца ў сталіцы (паколькі большасць цэнтраў акадэмічнай і ўніверсітэцкай навукі сканцэнтраваны менавіта ў Мінску), і магчымасць бесклапотнага існавання на працягу як мінімум двух гадоў (заканадаўства не дазваляе наймальніку звальняць маладога спецыяліста, які прыйшоў да іх па размеркаванні на працягу двух гадоў без сур'ёзнай прычыны), і абавязковае забеспячэнне жыллём (для іншагародніх выпускнікоў ВНУ наяўнасць якаснага і недарагога жылля ў сталіцы — важкі аргумент) з патэнцыяльнай магчымасцю будаўніцтва свайго ўласнага жылля (напрыклад, у Нацыянальнай акадэміі навук перыядычна будуецца жыллё для навуковых работнікаў). З іншага боку, вельмі шкада, калі таленавіты малады навуковец, які плённа працуе, вымушаны думаць пра вырашэнне жыллёвага пытання замест таго, каб скіраваць сваю энергію на вырашэнне фундаментальных і прыкладных навуковых задач.

Паколькі я з'яўляюся намеснікам старшыні Савета маладых навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук, магу абапірацца на канкрэтныя факты. Летась мы правялі ананімнае анкетаванне сярод навуковай моладзі Акадэміі і высветлілі, што ёсць шэраг фактараў, якія стрымліваюць яе прыток у навуку. Але абсалютная большасць адзначыла, што перашкодай з'яўляецца не столькі памер заработнай платы (ад сябе хачу заўважыць, што многія маладыя вучоныя, якія вядуць актыўную навуковую работу, прымаюць удзел

«Перашкодай на шляху ў навуку з'яўляецца не столькі памер заработнай платы, колькі вырашэнне жыллёвага пытання. Усё ж такі пражыванне ў інтэрнатах, нават камфортных, нельга параўнаць з пражываннем у асобнай кватэры — няхай і не ўласнай, а службовай».

ці нават кіруюць выкананнем праектаў і прамых дагаворных работ, маюць зусім нядрэнную заработную плату), колькі вырашэнне жыллёвага пытання. Усё ж такі пражыванне ў інтэрнатах, нават камфортных, нельга параўнаць з пражываннем у асобнай кватэры — няхай і не ўласнай, а службовай.

Зараз у краіне рэалізуецца праграма па будаўніцтве арэнднага жылля. Добры прыклад сацыяльнай падтрымкі маладых навукоўцаў — узвядзенне жылога комплексу «Магістр» для адоранай і таленавітай моладзі ў сталіцы. Савет маладых навукоўцаў выйшаў з прапановай да Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук, каб частку апланы за арэнднае жылле браў на сябе працадаўца (акадэмічны інстытут). Паколькі менавіта кадры вырашаюць усё, пры размеркаванні кватэр павінен улічвацца «каэфіцыент карыснасці» маладога навукоўца для арганізацыі. Перспектыўных, працалюбівых і крэатыўных маладых супрацоўнікаў, якія сваімі ідэямі і энергіяй будуць прасоўваць айчынную навуку наперад, трэба абавязкова падтрымліваць і стымуляваць. Такім чынам адначасова будуць стварацца і «сігнальныя маякі», на якія змогуць раўняцца іх калегі...

Таленавіты? Маеш права на бонусы

Вольга МІЦКЕВІЧ, першы сакратар Вілейскага раённага камітэта БРСМ:

— Мы просім разгледзець магчымасць укаранення ў краіне youth-card для адоранай і таленавітай моладзі, якая за дасягненні і высокія паказчыкі ў навуцы, культуры, спорце, грамадскім жыцці мела б магчымасць дзяжуючы гэтым спецыяльным карткам атрымліваць зніжкі на білеты на розныя віды транспарту, арэнду аўтамабіляў, веласіпедаў, наведванне тэатраў, цырка, кінатэатраў і г.д. Гэта маглі б быць пераможцы і прызёры рэспубліканскіх конкурсаў, чые праекты працуюць, выдатнікі вучобы — за значныя дасягненні ў ёй. Кожны каледж, інстытут, універсітэт маглі б вылучаць такія кандыдатуры, калі маладыя людзі зрабілі нешта значнае для сваёй навучальнай установы: праславілі яе навуковай працай, публікацыяй. Чым будзе большы памер, тым лепш. З іншага боку, калі дасягненне юнака ці дзяўчыны прызналі на высокім узроўні, дастаткова было б і 5-працэнтнай зніжкі. У Еўропе, дарэчы, для студэнтаў існуюць спецыяльныя студэнцкія карткі, на якіх у іх трымальнікаў назапашваюцца бонусы за асабістыя заслугі. Гэтак жа можна было б зрабіць і ў нас. Укараняць такую сістэму заахвочвання трэба на дзяржаўным узроўні. Суб'ектам гаспадарання, якія будуць удзельнічаць у гэтай праграме і прадастаўляць таленавітай моладзі зніжкі, фінансавыя выдаткі на іх пагашала б дзяржава. У рэшце рэшт, праекты таленавітай моладзі працуюць на карысць краіны. У нас жа працуе сістэма грантаў!

Малады спецыяліст заслугоўвае большага

Ірына ДАМАРОНАК, першы сакратар Крупскага раённага камітэта БРСМ:

— Моладзь раёна выказалася за тое, каб на кіруючыя пасады вылучалася як мага больш маладых людзей. Прапануем заканадаўча замацаваць за прадпрыемствамі, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца маладыя людзі да 31 года, права на льготнае крэдытаванне ці хаця б частковае вызваленне ад выплаты падаткаў тэрмінам, напрыклад, да аднаго года. І тут агучваліся розныя прапановы. Калі гаворка ідзе, скажам, пра прыватнае ўнітарнае прадпрыемства, значыць, даваць такую льготу на падаткі самому прыватніку. Калі пра маладзёжны калектыў — тады яго спецыялістам. У іх, як вядома, шмат розных праблем. Нехта хоча аўтамабіль, хтосьці — СВЧ або набор мэблі. Тых «пад'ёмных», якія выплачваюць маладым спецыялістам, не заўсёды дастаткова. Так, адзін з банкаў прапануе выгадны крэдыт, але толькі той моладзі, якая прыехала па размеркаванні ў іншы раён. А тым, хто вярнуўся ў свой, умоўна кажучы, да бацькоў, яго не атрымаць.

Мы абмяркоўвалі пытанне, каб членства ў БРСМ прыносіла маладым людзям большыя дывідэнды, чым цяпер. Пяціпрацэнтная зніжка на наведванне басейна ці «трэнажоркі» — гэта, безумоўна, здорава, але хацелася б больш рэальнай дапамогі. Зразумела, што на атрыманне дывідэндаў усе разлічваць не могуць. Проста быць членам БРСМ для гэтага недастаткова. Напрыклад, мы былі ў Растове-на-Доне, знаёміліся з досведам расіян. У іх, калі ты з'яўляешся членам Расійскага саюза моладзі і добра сябе зарэкамендаваў, існуе асобная чарга для маладых сем'яў па паляпшэнні жыллёвых умоў.

Падарыць сем'ям радасць бацькоўства

Ксенія ХАРАШЫЛАВА, першы сакратар Нясвіжскага раённага камітэта БРСМ:

— У Расійскай Федэрацыі прынята дзяржпраграма, згодна з якой бяздзетным сямейным парам, якія доўгі час стаяць на адпаведным уліку, робяць бясплатнае штучнае апладненне. У нашай краіне адчуваецца дэмаграфічны крызіс. На жаль, у апошні час колькасць бясплодных пар павялічваецца. Атрымаць лячэнне і зрабіць штучнае апладненне ў нас можна толькі на платнай аснове, і каштуе гэта немалых грошай — 20-30 мільёнаў рублёў. Канешне, пад гэтыя мэты нядаўна ўвялі крэдыт. Аднак трэба ўлічваць, што даход маладой сям'і, як правіла, не вельмі вялікі, ды і абжыцца, як кажуць, ёй трэба. Чаму б тады не пераняць практыку суседняй краіны?

Яшчэ адно пытанне ў гэтым жа кантэксце — узрост. Зараз усё большую папулярнасць набываць познія шлюбы. У яго можна ўступіць, напрыклад, у 30 гадоў. І пакуль выявіцца праблема з бясплоддзем, можа прайсці некалькі гадоў. За гэты час сям'я згубіць статус маладой, хаця фактычна — па колькасці праведзеных сужэнцамі разам гадоў — будзе заставацца менавіта такой. Таму нам падаецца, што трэба ўвесці пэўны прамежак часу (з улікам даты ўступлення ў шлюб, напрыклад, пяць гадоў), калі б людзі, сутыкнуўшыся з праблемай адсутнасці дзяцей, маглі скарыстацца бясплатным штучным апладненнем, ужо фактычна не будучы ў статусе маладой сям'і.

Падрыхтавалі Надзея НІКАЛАЕВА і Сяргей РАСОЛЬКА.

Ідэі маладых

НА «ВАДЗЯНЫ ВЕЦЕР» ГРОШАЙ НЕ ШКАДА

Прапануйце цікавыя праекты! Лепшыя з іх падтрымаюць

У 2015-м, які аб'яўлены ў Беларусі Годам моладзі, у Гродне адкрыецца філіял Парка высокіх тэхналогій. Аб гэтым старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ расказаў на сустрэчы са студэнтамі медыцынскага, аграрнага, «купалаўскага» ўніверсітэтаў і навучэнцамі іншых адукацыйных устаноў рэгіёна. Ён лічыць, што гэта будзе выдатная пляцоўка для выкарыстання здольнасцяў і патэнцыялу маладых людзей у інтарэсах інавацыйнага развіцця нашай краіны.

Фота БЕЛТА.

Сустрэча з моладдзю ў фармаце адкрытага дыялогу, у якім разам з кіраўнікамі ўладных структур удзельнічаў **першы сакратар Цэнтральнага камітэта ГА «БРСМ» Ігар БУЗОЎСКІ**, адбылася ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Там жа была разгорнута абласная выстава рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі».

Напрыклад, **вучань СШ №12 г. Гродна Леанід ГАНЧАР** прэзентаваў праект «Віртуальны музей тэхнікі часоў Вялікай Айчыннай вайны». Гэта электронны рэсурс, які дазваляе выкарыстоўваць мадэлі тэхнікі для стварэння анімацыйных 3D фільмаў, рэканструкцый падзей. Пры распрацоўцы ідэі, якая належыць творчай групе Гродзенскага абласнога цэнтра тэхнічнай творчасці, карысталіся чарцяжамі і фатаграфіямі рэальных экзэмпляраў баявой тэхнікі. Праект стаў пераможцам гарадскога этапу конкурсу «100 ідэй для Беларусі» і будзе рэалізаваны, атрымаўшы ад Гродзенскага гарвыканкама сертыфікат на 50 мільёнаў рублёў.

На абласным этапе конкурсу быў прадстаўлены 21 праект у самых розных сферах — прамысловасці, сельскай гаспадарцы, энергазберажэнні, экалогіі, медыцыне, інфармацыйных тэхналогіях, адукацыі, гісторыі, культуры, архітэктуры... У прыватнасці, адзін з лепшых маладых рацыяналізараў Беларускай чыгункі, **інжынер лакаматыўнага дэпо г. Ліда Аляксандр ЗЯНЬКЕВІЧ** распрацаваў спосаб аднаўлення манаблока дызеля ў цеплавозах, якія выкарыстоўваюцца ў Беларусі і іншых краінах постсавецкай прасторы. **Студэнтка фізіка-тэхнічнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына ЧАРНЯКОВА** прапанавала ідэю партатыўных зарадных устройстваў шляхам сумяшчэння сонечных батарэй з адзеннем, сумкамі для ноўтбукаў і іншымі прадметамі паўсядзённага ўжытку. Мэта праекта **дзесяцікласніка гродзенскай гімназіі № 4 Канстанціна ГРАМЫКІ** «Вадзяны вецер» — атрыманне электраэнергіі невялікай магутнасці для лакальных мэт. А праект «Погляд у мінулае праз сучаснасць» **мастака ў стылі «графіці» Дзмітрыя СМАГІНА** скіраваны на тое, каб упрыгожыць гарадскія вуліцы элементамі нашай гістарычнай спадчыны ў выглядзе нацыянальных беларускіх арнаментаў.

Журы вызначыла трох пераможцаў конкурсу, а яшчэ пяць праектаў адзначаны спецыяльнымі прызамі.

— Усе праекты па-свойму ўнікальныя і актуальныя, а многія жыццяздольныя нават на камерцыйным узроўні. Конкурс даказаў, што ў моладзі шмат цікавых ідэй — трэба толькі іх убачыць і дапамагчы рэалізаваць, — упэўнены старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў. — Магчыма, трэба стварыць рэгіянальную студэнцкую арганізацыю, якая акумулявала б і лабіравала інавацыйныя праекты. Але каб гэта працавала, ініцыятыва павінна зыходзіць ад самой моладзі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЦІ МОЖНА «КУПІЦЬ» РАЗМЕРКАВАННЕ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Па словах кіраўніка БРСМ, такімі праектамі, у тым ліку ў Еўропе, з'яўляюцца валанцёрскія праекты Еўрапейскай валанцёрскай службы.

— Уступленне ў яе было для нас фармальным крокам, які дазваляе ў далейшым развіваць сумесныя праекты. Акрэдытацыя дае магчымасць прымаць удзел у валанцёрскіх праектах Еўропы. Акрамя гэтага, зараз мы ўжо ставім перад сабой мэту атрымаць другую частку акрэдытацыі — магчымасць прымаць моладзь з Еўропы на тэрыторыі нашай краіны. Гэта больш складаная ступень, таму што трэба заваяваць пэўны давер, атрымаць практычныя веды па еўрапейскіх праграмах.

АД ІДЭЙ ДА ІХ РЭАЛІЗАЦЫІ

Праект «100 ідэй для Беларусі» мае даволі вялікую гісторыю.

— Напачатку мы размяшчалі скрынкі для «збору ідэй» у навучальных установах, выязджалі на аўтобусе па ўсёй краіне і расказвалі пра сутнасць «100 ідэй», праводзілі выставы праектаў у рэгіёнах, — прыгадаў прадстаўнік БРСМ. — Пасля мы пайшлі па іншым шляху, бо зразумелі, што важна знайсці падтрымку ад структур, закліканых скарыстацца гэтымі ідэямі. Нас падтрымалі, і мы пераканаліся, што попыт на такія распрацоўкі — каласальны.

— Калі проста аддаваць ідэі, то чалавек, які ўсё прыдумаў, хутчэй за ўсё, нічога не атрымае, — лічыць Ігар Бузоўскі.

Летась упершыню 10 пераможцаў праекта атрымалі гранты, іх ідэі зараз рэалізуюцца. Грошы тыя невялікія, але яны даюць магчымасць хаця б скласці бізнес-план, а ён сёння каштуе прыкладна тысячу долараў. Цяпер штогод лепшыя дзесяць ідэй будуць адбірацца для іх далейшай рэалізацыі.

«Мы пайшлі па іншым шляху, бо зразумелі, што важна знайсці падтрымку ад структур, закліканых скарыстацца гэтымі ідэямі. Нас падтрымалі, і мы пераканаліся, што попыт на такія распрацоўкі — каласальны».

— Нашы пераможцы не проста атрымалі грошы. Яны атрымалі яшчэ і падтрымку — інфармацыйную, інтэлектуальную, арганізацыйную, што таксама адыгрывае значную ролю, — заўважыў суразмоўца.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

Ёсць прапанова!

Праект «Разумныя сеткі» па падрыхтоўцы аналітыкаў для дзяржаўных устаноў набірае абароты. Адзін з тых, хто актыўна пачаў працаваць з гэтай ініцыятывай, — Яўген НОСАЎ, магістрант Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Зараз ён распрацоўвае праграму па даследаванні электронных мас-медыя і іх уплыве на грамадскую думку.

ВЫЯВІМ «ГРУПЫ ЎПЛЫВУ»

Ад каментарыяў залежыць успрыняцце навін

— У магістратуру я паступіў дзякуючы «Разумным сеткам», — прызнаецца Яўген, які паралельна з вучобай займаецца прасоўваннем інтэрнэт-сайтаў. — Летась падаў заяўку, напісаў эсэ, а пасля, калі быў залічаны, атрымаў прапанову працягнуць вучобу ў Акадэміі кіравання.

— Цікава, а чым цябе захапілі «Разумныя сеткі»?

— Я заўжды быў актыўным. У гэтым праяўляецца мая жыццёвая пазіцыя. Мне здалося, што з гэтым праектам з'явіўся шанц нешта данесці да тых людзей, якія прымаюць у нашай краіне важныя рашэнні. Я проста вырашыў скарыстацца гэтай магчымасцю. Разам з астатнімі ўдзельнікамі «Разумных сетак» мы збіраемся на навуковых канферэнцыях двойчы на год, дзе актыўна абмяркоўваем нашы ідэі і прапановы. Дэбаты бываюць гарачыя, але мы заўжды прыходзім да адзінага пункту гледжання.

— Інтарэс да маладых аналітыкаў з боку чыноўнікаў адчуваецца?

— Мой мабільны тэлефон ад прапаноў не разрываецца, але зацікаўленасць ёсць.

Фота Надзеі БУЖАН.

Вельмі прыемна тое, што некалькіх удзельнікаў ужо прынялі на дзяржаўную службу. Як я зразумеў, мой праект дзяржаўным органам таксама цікавы.

— А калі ты ўпершыню задумаўся аб сваім даследаванні?

— Я ўжо даўно цікаўлюся ўплывам анлайнавых сродкаў масавай інфармацыі на грамадства, сам раней актыўна каментаваў навіны ў сеціве. Добра ведаю ўсю спецыфіку. Напрыклад, знаёмы ў размове са мной паўтараў нават не навіны, а каментарыі чытачоў аднаго партала. Чым больш чалавек чытае негатыўных навін, тым больш негатыўна будзе разважаць аб пэўных з'явах нашага жыцця. Ён часта не задумваецца над прачытаным і пачынае верыць каментарыям пад тэкстам, якія паўтараюць характар навін. І чым больш «плюсікаў» паставяць пад каментарыем, тым больш чалавек схільны верыць у праўдзівасць гэтага погляду. Усё гэта важна, і мой праект будзе вырашаць адразу некалькі задач. З яго дапамогай можна ацэньваць характар навіны і настрой каментатара ў жывым эфіры, выяўляць групы ўплыву, сайты, якія, напрыклад, асвятляюць эканоміку толькі ў негатыўным свеце. Складзецца малюнак, які будзе характарызаваць не толькі сайты, але і каментатараў.

— Як ты ставішся да мадэрацыі каментарыяў на інтэрнэт-сайтах?

— Нармальна, бо ў іншым выпадку абмеркаванне навін пераўтварылася б у нешта незразумелае. Мадэрацыя неабходная. На маю думку, яна прывівае культуру ў перапісцы. З іншага боку, мадэратар можа не выставіць каментарый па суб'ектыўных прычынах. Мне наогул адной-чы забаранілі доступ да адной суполкі і назвалі «праўладным тролем».

— Яўген, а што карыснага табе даў твой праект?

— Зразумеў, як фарміруецца грамадская думка. Пачаў больш крытычна ставіцца да таго патоку інфармацыі, з якім сутыкаюся кожны дзень. Таксама заўважыў цікавыя тэмы, якія, на мой погляд, наогул не асвятляюцца журналістамі.

— Напрыклад?

— Я даўно не чытаў рэпартажы аб прадпрыемствах, якія вырабляюць на экспарт высокатэхналагічную прадукцыю. У свой час навукова-тэхнічны комплекс «Планар» быў адным з трох прадпрыемстваў у свеце, якія выраблялі стэкеры, прылады для мікрасхем на крэмніевых накладках.

— Ці бачыш у сваёй праграме фінансавую выгаду?

— Гэта маё хобі, якім займаюся ў вольны ад працы час. Грошы гэты праект мне не прыносіць. Я планую стварыць сайт, своеасаблівы рэйтынг СМІ, дзе ў адкрытым доступе будзе знаходзіцца ўся інфармацыя.

Тарас ШЧЫРЫ.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
20 11 2014 г.

Тварыць дабро

МАЙСТЭРНЯ ЧАЛАВЕЧАГА ШЧАСЦЯ

Пазбегнуць размеркавання, каб не ехаць у рэгіёны і не займацца тым, чаму вучыўся да гэтага колькі гадоў — на жаль, мара некаторых выпускнікоў. А ёсць іншая катэгорыя маладых людзей — тых, для каго праца становіцца марай, часцей за ўсё невыканальнай. Гэта юнакі і дзяўчаты, якім яшчэ ў маленстве паставілі несуцяшальныя дыягназы і якія аказваліся па-за грамадскім жыццём, заціснутыя ў свой маленькі сусвет. Аб працоўным месцы яны толькі мараць. Аднак дапамагчы ім можна, як гэта робяць, напрыклад, у цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Лагойскага раёна, дзе сёлета адкрылася рэабілітацыйна-працоўная майстэрня па выпуску сувенірнай прадукцыі. Маладыя людзі з асаблівасцямі могуць не толькі праявіць тут свае творчыя здольнасці, але і вучацца зарабляць грошы.

Кабінет, у якім знаходзіцца творчая майстэрня, выглядае як маленькі музей. Наўкол — дзясяткі «экспанатаў»: сувенірныя штучныя расліны, карціны, вышытыя «крыжыкам», малюнкі. Асаблівую цікаўнасць выклікаюць лялькі: іх тут шмат і яны вельмі незвычайныя. Ёсць, напрыклад, модныя зараз лялькі «без твараў». Кажуць, што такія цацкі маюць магічную сілу і, у адрозненне ад фабрычных, не могуць нашкодзіць малому. Ці, напрыклад, дзіцячыя лялькі для сну, набітыя пахучымі зёлкамі.

З першага погляду і не здагадаешся, што гэтыя рэчы створаны рукамі інвалідаў. Акуратна зробленыя, непаўторныя, вельмі прыгожыя — такі асартымент можна сустрэць у крамах, што гандлююць «хэндмэйдам» — сувенірамі ручной працы ў выкананні прафесіяналаў.

Кацярына хварэе на сіндром Даўна, Вольга — на дзіцячы цэрэбральны параліч. Але дзяўчаты штодзень прыходзяць сюды, каб пабачыць сваіх сяброў і заняцца любімай справай.

— У цэнтры мне падабаецца займацца вышыўкай, плесці з бісеру, — кажа Кацярына. — Люблю рабіць цацкі. Напрыклад, зараз мы шыем саву. У гэтым пакоі многа сувеніраў, зробленых маімі рукамі. А яшчэ я люблю хадзіць у камп'ютарны клуб.

— Мы вельмі шмат рознага робім у майстэрні, — дапаўняе Вольга. — Мне тут, дзе многія — мае сябры, таксама вельмі цікава. Я абавязкова буду хадзіць сюды і надалей.

Наталля НАВІЦКАЯ — загадчык аддзялення дзённага знаходжання. Яна працуе тут ад самага заснавання, лічыцца адным са «старажылаў»:

— Напачатку на базе аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў у нас працавала некалькі творчых гурткоў і клубаў, у тым ліку па вытворчасці сувеніраў. Пазней, калі мы ўбачылі, што нашы выхаванцы дасягнулі пэўнага ўзроўню, а прадукцыя, зробленая іх рукамі, карыстаецца попытам на святочных кірмашах, узнікла ідэя аб стварэнні майстэрні. Не дачакаўшыся падтрымкі ад іншых арганізацый, вырашылі

Загадчык аддзялення Наталля Навіцкая.

патроху рэалізоўваць задуму самі. Абсталявалі памяшканне, закупілі тэхніку і ў жніўні пачалі заняткі. Падобныя ідэі ўжо рэалізоўваліся ў іншых гарадах: нехта ствараў тэатр ці музычную студыю. А мы палічылі, што для Лагойска найбольш актуальнай будзе менавіта такая майстэрня, бо наш горад развіваецца ў турыстычным кірунку.

Святлана Львова з выхаванцамі.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Па словах Наталлі Навіцкай, галоўная задача творчай майстэрні і іншых гурткоў — навучыць маладых людзей, чыё жыццё абмежавана фізіялагічнымі асаблівасцямі, уласнаручна рабіць тыя простыя рэчы, што дапамогуць ім самастойна жыць і, магчыма, працаваць. Вырабы, створаныя навучэнцамі, людзі набываюць з задавальненнем. Атрыманыя грошы ідуць на набыццё расходных матэрыялаў, абсталявання. У гурткох вучаць зусім, здавалася б, простаму. Напрыклад, ладзяць заняткі па кулінарыі. Разам з выкладчыкамі выхаванцы выбіраюць страву, якая ім даспадобы, складаюць спіс неабходных прадуктаў, разам ідуць у краму і набываюць іх. Вядома ж, разам гатуюць. Гэта робіцца, каб маладыя людзі праходзілі ўвесь працэс ад самага пачатку і пры неабходнасці маглі аднавіць яго ў памяці. Бо тое, што для іншых звыкла, ім даецца зусім не проста.

Галоўная «рухальная» ідэя майстэрні — думка пра тое, што людзей з асаблівасцямі можна пазбавіць ад штодзённых пакут і залежнасці ад іншых. Як важна, калі твае магчымасці абмежаваныя, мець шанц на працу, пацвярджае гісторыя, расказаная спадарыняй Навіцкай:

— Калісьці да нас у цэнтр прывялі дзяўчыну. Яна вылучалася сваёй мэтанакіраванасцю: пасля школы атрымала сярэднюю спецыяльную адукацыю і нават спрабавала паступіць у ВНУ, але ёй адмовілі з-за стану здароўя. Яна вельмі хацела працаваць, сама пачала шукаць аб'явы, прапаноўваць свае паслугі працадаўцам. Аднойчы прыйшла да нас вельмі ўзрадаваная: у адну з мясцовых гаспадарак патрабаваліся людзі, што будуць збіраць у полі камяні. Аднак радасць хутка змянілася крыўдай: маці была супраць. Але жанчына вырашыла ўсё ж такі параіцца з намі. Мы патлумачылі: калі забараніць дачцэ хаця б спробу

«Падобныя ідэі ўжо рэалізоўваліся ў іншых гарадах: нехта ствараў тэатр ці музычную студыю. А мы палічылі, што для Лагойска найбольш актуальнай будзе менавіта такая майстэрня, бо наш горад развіваецца ў турыстычным кірунку».

працаўладкавання, заўсёды будзе думаць, што яе падманулі. Нарэшце, дзяўчына накіравалася на працу. Праз пяць дзён ізноў прыйшла да нас са словамі: «Цяпер я разумею, як гэта цяжка — па-сапраўднаму працаваць». Мы робім усё для таго, каб такі пераход да працы ўвогуле быў магчымы.

Усяму гэтаму я навучылася яшчэ ў школе — наведвала гурткі, цікавілася ручной працай. Акрамя таго, скончыла школу мастацтваў, маю вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці «Сацыяльны педагог». Работа мне падабаецца: вучні спакойныя, уседлівыя і вельмі руплівыя. Паўтарыць

Асаблівую цікавасць выклікаюць лялькі: іх тут шмат і яны вельмі незвычайныя.

Заняткі ў майстэрні правядзіць **інструктар па працоўнай тэрапіі Святлана ЛЬВОВА.** Жанчына родам з Курганскай вобласці Расіі, на Лагойшчыне апынулася пасля таго, як выйшла замуж за беларуса:

— Калі ўладкоўвалася на працу, мне казалі, што патрабуецца чалавек, які ўмее рабіць рукамі ўсё: шыць, вышываць, вязаць, маляваць... самі выбіраюць, што будуць рабіць, і могуць уносіць у работы любыя змены, якія падаюцца ім патрэбнымі. Такім чынам праяўляюць свой густ. Не магу назваць нешта адно, што захапляла б усіх навучэнцаў. Як і ўсім дзецям, ім падабаецца мяняць від дзейнасці. У некаторых добра атрымліваецца вышываць, у іншых — кроіць тканіну. Што датычыцца нашых адносін з выхаванцамі, то я назвала б іх сяброўскімі. Гэта вельмі адкрытыя людзі, поўныя дабрыні. Людзі, у якіх абсалютна адсутнічае зло.

Супрацоўнікі Лагойскага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва дапамагаюць родным зразумець, што дыягназ — не прысуд. Ладзяць цікавыя мерапрыемствы для выхаванцаў: ездзяць у экскурсіі па раёне і краіне, праводзяць сумесныя дыскатэкі з дзецьмі са звычайных школ. І не столькі дапамагаюць жыць інвалідам сярод здаровых людзей, колькі, наадварот, — здаровым побач з інвалідамі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
Мінск — Лагойск — Мінск.

МІКІТАЎ ДАР...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Яшчэ ён прыгадвае, што ў будынку на Карла Маркса, дзе займаліся «філосафы», не было ліфта. Але і гэта для яго было вырашальнай справай. «Я прыязджаў на 20 хвілін раней за дамоўлены час і падымаўся на пяты паверх пешшу. На трэцім ужо ўваходзіў у рытм — і падымацца было проста».

БЫЦЬ ЗАЎЖДЫ ГАТОВЫМ

Псіхолагі гавораць, што ўзровень шчасця чалавека (і, адпаведна, узровень яго матывацыі) залежыць ад адчування каштоўнасці сваёй працы для іншых. Задача маркетынгавага кансультанта — паказаць магчымасці, як можна зарабіць больш грошай.

— Раней я пісаў калонкі ў часопіс кампаніі «Белавія», а таксама рэцэнзіі на бізнес-літаратуру на розных сайтах. Займаўся таксама капірайтынгам, але пакуль адышоў ад гэтага. Акрамя таго, што я штодзённа раблю мінімум чатыры важныя справы, даводзіцца заўжды быць гатовым да працы — мне могуць патэлефанаваць у любы час.

...Памятаю, калі мяне запрасілі на «TEDx Minsk», адразу сказалі: «Нам патрэбны чалавек, які б натхніў гледачоў». І гэтай асобай павінен быў стаць я. Так і атрымалася.

Перад выступленнем у мяне было шэсць варыянтаў тэкстаў пра мастацтва сяброўства (мая заяўленая тэма). Але перад выхадам на сцэну я вырашыў, што буду казаць як ёсць, ад сябе. І не дарэмна. У выніку атрымаў прыз глядацкіх сімпатый.

— У мяне ёсць 13 сяброў, якім я магу даверыцца. Ёсць Муза, з якой мы дапрацоўваем наш першы зборнік і пачынаем другі. Збіраюся паспрабаваць запісаць трэкі: вершы пад падыходзячую музыку. Не так даўно ў маім жыцці з'явілася дзяўчына, і цяпер мне хочацца казаць ужо не «я», а «мы». Самае галоўнае ў стасунках — гэта спакой, падтрымка і ўпэўненасць. Адчуванне, што ў любой справе «я не адзін», а «мы разам». Паміж намі гэтае адчуванне ёсць, — дзеліцца асабістым Мікіта. — Я веру, што ў кожнага чалавека ёсць свой асаблівы дар. Вось, напрыклад, адна з маіх сябровак не можа казаць лухту. Кожную сваю думку здольная аргументаваць і патлумачыць. А мой тата мае талент станоўча ўздзейнічаць на чыноўнікаў. Калі ў мяне будзе пэўная праблема і я звярнуся некуды па дапамогу, хутчэй за ўсё, пачую звычайнае: «Чакайце пісьмовы адказ на працягу 15 працоўных дзён». Дастаткова ж майму бацьку

«Мне «хапіла» надомнага навучання ў школе і адчування, што цябе ніхто не ведае. Калі я атрымліваў залаты медаль, толькі адзіны чалавек прыгадаў мяне і падышоў паціснуць руку...»

зайсці ў кабінет і папрасіць пра тое самае — і пытанне вырашаецца за тры дні. І гэта без сувязяў ці іншых метадаў уздзеяння... А мой асабісты дар — бачыць здольнасці і таленты іншых і казаць пра іх.

Сябры навучылі Мікіту ставіцца да хваробы як да пэўнай асаблівасці, якія ў кожнага свае. У яго — такая.

— Камусьці, напрыклад, страшна тэлефанаваць незнаёмцу. А я павінен уважліва выбіраць, куды магу пайсці. Наколькі зручна даехаць да месца на машыне, ці неабходна стэлефаноўвацца загадзя, каб хтосьці мяне сустрэў і пранёс мыліцы, — тлумачыць хлопец. — Я не заўжды магу паехаць куды-небудзь, таму часта прымаю гасцей дома. Я лічу так. Калі чалавек прыходзіць да цябе, трэба імкнуцца сказаць яму самае добрае і лепшае, што бачыш у ім. Калі не рабіць гэтак, навошта ўвогуле жыць?

Вераніка ПУСТАВІТ,
студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.

ДАВЕДКА

«TED» — амерыканскі фонд, які існуе з 1984 года. Назва складаецца са скарочаных англійскіх слоў «Тэхналогіі, забавы, дызайн». Ён штогод арганізоўвае канферэнцыі, на якіх людзі прэзентуюць пэўную ідэю з любой сферы жыцця. Выступленне здымаецца на відэа і выкладваецца на сайце арганізацыі. Такім чынам фонд садзейнічае развіццю ўнікальных ідэй.

Праект «TEDx» — гэта магчымасць арганізоўваць свае канферэнцыі з выступленнямі. Імпрэзы лічацца незалежнымі ад фонду (не атрымліваюць фінансавай падтрымкі), але дзейнічаюць па ліцэнзіі галоўнай арганізацыі. «TED» — гэта шматтысячная база відэаролікаў на англійскай мове літаральна пра ўсё на свеце.

У стылі анімэ

ВАХЦЁРКА ІНТЭРНАТА Ў ЗАМКУ ХАЎЛА,

або Як патрапіць у любімы «мульцік»

Уявіце сабе натоўп падлеткаў, апранутых у рознакаляровыя касцюмы самых неверагодных стыляў, у парыках усіх адценняў вясёлкі, з размаляванымі тварамі і яркімі лінзамі ў вачах. Прыкладна так выглядае злёт «анімэшнікаў». У Беларусі прыхільнікаў японскай анімацыі, камп'ютарных гульняў і коміксаў шмат. Раз у год вялікай грамадой яны збіраюцца на вялікі двухдзённы фестываль «Хіган», які нядаўна прайшоў у Мінску ў дзявяты раз, у касцюмах сваіх любімых персанажаў, ладзяць сцэнкі, дэфіле і конкурсы. Дык што гэта — хобі, магчымасць самарэалізацыі ці лад жыцця маладых?

Я так хачу быць табой!

...Сярод іншых заўважаем «унучку» ў мужчынскім касцюмчыку разам з «бабуляй» у блакітнай сукенцы. Бывалы «анімэшнік» пазнае ў іх персанажаў стужкі выдатнага японскага рэжысёра Хаяа Міядзакі «Замак Хаўла, які перасоўваецца» — чараўніка Хаўла і бабулю Сафі. Дзяўчына пажадала застацца пад псеўданімам Кіці і адразу паведаміла: «Мы не сваякі. Больш за тое, я жыву ў інтэрнаце, дзе «Сафі» працуе вахцёркай». Аказалася, што ў дзяўчыны даўно была мара пераапрануцца ў касцюм свайго любімага персанажа, і яна доўга думала, прыкідвала варыянты: як лепш выступіць. «Убачыўшы на вахце Наталлю Уладзіміраўну, я адразу зразумела — гэта ж Сафі! І прапанавала ёй далучыцца да касплэю» (так называецца касцюмаваная гульня, пераўвасабленне ў экранны вобраз. — **Аўт.**). Наталлі было цікава паспрабаваць сябе ў новым амплуа. На фестывалі, акружаная моладдзю, жанчына адчувала сябе цудоўна.

— Я рыхтавалася да выступлення грунтоўна: прачытала кніжку, паглядзела «мульцік», і ўсё ж моцна хвалявалася: гэта быў мой дэбют, — распавяла Наталля Макарава. — Касцюм — блакітную сукенку — пашыла мая сяброўка. А Кіці свой касцюм зрабіла сама.

Студэнтку першага курса БДУІР Дар'ю мы напачатку прынялі за школьніцу: ёй настолькі добра ўдалося ўжыцца ў ролю адважнага хлопчыка, галоўнага героя папулярнага анімэ «Нарута». «Ён вельмі блізкі мне па духу, бо гэта вясёлы, добры персанаж, які перамагае зло», — патлумачыла дзяўчына. Летась яна таксама ўдзельнічала ў «Хігане» і таксама была Нарутам, толькі ў іншым касцюме. Дарэчы, фестывальнае адзенне — аранжавы камбінезон з нашыўкамі, пальчаткі і шлёпанцы — рабіла сваімі рукамі. Сярод удзельнікаў гульні хэндмэйд — вельмі распаўсюджаная з'ява, бо арыгінальныя касцюмы персанажаў каштуюць вельмі дорага. А многім аматарам «пераапранянняў» касплэй падабаецца менавіта з-за магчымасці самастойна пашыць цікавае нестандартнае адзенне.

Чым прываблівае карэйская «папса»?

Аматары капіруюць не толькі касцюмы любімых анімэ-персанажаў. Многія падлеткі, у тым ліку і беларускія, захапляюцца сучаснай маладзёжнай культурай — эстраднымі выканаўцамі Паўднёвай Карэі, Тайваня, Японіі. Дзяўчаты любяць спяваць японскія хіты альбо пераймаць танцы сваіх куміраў. Такія калектывы называюцца «кавер-камандамі», а на «Хігане» для іх створаны асобныя намінацыі — за лепшае караоке альбо танец. Мы пагутарылі з дзяўчатамі адной з першых беларускіх кавер-каманд кірунку k—pop Seoulmates. «K—pop, папросту кажучы, — гэта карэйская «папса», — тлумачыць кіраўнік групы Тацяна. — У Паўднёвай Карэі рух вельмі папулярны, ёсць шмат цікавых як хлапечых, так і дзявочых груп. Нас гэты кірунак прываблівае сваім шоу: звычайна гэта яркія, эфектныя, рытмічныя выступленні». Да Таццяны далучаецца Вольга, якая паўгода працавала танцоркай у дзіцячым парку ў Карэі.

«Мы вырашылі пераняць іх вопыт — збіраемся ў Гомелі і прагульваемся ў сваіх строях. Людзі, асабліва прадстаўнікі старэйшага пакалення, рэагуюць вельмі пазітыўна».

— Многім групам ставяць танцы суветна вядомыя харэографы. Калі нам падабаецца нейкі танец, мы цалкам яго капіруем, касцюмы таксама дубліруем, — кажа яна.

У камандзе сем дзяўчат, дзве з іх прафесійна займаюцца танцамі. Вольга адзначыла, што пачынала з беларускіх народных, але, убачыўшы кліпы карэйскіх выканаўцаў, вырашыла пераключыцца на k—pop і спярша спявала ў караоке. Выступаюць Seoulmates у асноўным у Беларусі, дзе праводзяцца не толькі тэматычныя фестывалі, але і штомесячныя сустрэчы. Амаль уся каманда пабывала ў Азіі: дзяўчаты, вяртаючыся ў Беларусь, прывозяць новыя ідэі для будучых выступленняў.

Наталля Уладзіміраўна — гэта на працы, а на «Хігане» — бабуля Сафі.

«Убачыўшы на вахце Наталлю Уладзіміраўну, я адразу зразумела — гэта ж Сафі! І прапанавала ёй далучыцца да касплэю».

«Каваі» на гомельскіх вуліцах

Сёстры Кацярына і Ганна з Гомеля прыцягвалі ўвагу сваімі адмысловымі сукенкамі.

— Мы — прыхільніцы японскай вулічнай моды і субкультуры «каваі», што ў перакладзе азначае «мілы», — адказалі дзяўчаты на пытанне «Каго вы капіруеце?». — Вопратка — гэта спосаб самавыяўлення. Самастойна імкнёмся даведацца больш пра японскія брэнды і маладых дызайнераў. Ведаеце, яны самі шыюць адзенне ды яшчэ дэфіліруюць у ім па вуліцах. Мы вырашылі пераняць іх вопыт — збіраемся ў Гомелі і прагульваемся ў сваіх строях. Людзі, асабліва прадстаўнікі старэйшага пакалення, рэагуюць вельмі пазітыўна. Даволі часта да нас падыходзяць, запытваюцца — мы з задавальненнем распавядаем пра сваё захапленне.

Дзяўчатам падабаецца быць яркімі. Яны адразу патлумачылі: «Мы не замыкаемся толькі на японскіх брэндах, а сочым яшчэ і за высокай модай, «Дольчэ і Габана» альбо «Шанэль». Дарэчы, вопратку модніцы замаўляюць па інтэрнэце на японскіх аўкцыёнах. Цэны бываюць розныя: касцюм можна набыць і за 200 долараў, і нават за 600. Цікава, што каб сэканоміць на касцюме, можна набыць і сэканд-хэнд. У такім разе, цэны вельмі прывабныя. Свае «старыя» сукенкі сёстры таксама прадаюць на аўкцыёнах.

Дзяўчаты ўжо пяць гадоў з'яўляюцца прыхільніцамі стылю «каваі». Раней яны былі «касплэерамі» і самі шылі сабе касцюмы. Ад анімэ плаўна перайшлі да моды. Ганна замужам і мае дзіця. Але сваё захапленне сям'і не навязвае. Муж Ганну падтрымлівае — фатаграфуе, здымае відэа, манціруе, але сам далучыцца не хоча. А малады чалавек Кацярыны ставіцца да захаплення сваёй выбранніцы з асцярожнасцю.

Кацярына РАДЗЮК.

З такой прыгажуняй многія хацелі б пазнаёміцца, калі б не зброя ў яе руках...

Касплэй — гэта калі мілая дзяўчына выпілоўвае сабе велізарны лук.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Вы ў фінале!

ПЕРАЎТВАРЫЦЬ ІНТЭРВ'Ю Ў ЖАРТ?

Гэта па сілах сапраўднаму КВЗшніку

Калі смех для многіх — толькі праява добрага настрою, то для людзей, пра якіх зараз пойдзе гаворка, ён — само існаванне. А калі гумар становіцца неад'емнай часткай жыцця, то дарога абавязкова прывядзе ў КВЗ. Восень для КВЗшнікаў з'яўляецца вельмі насычанай парой — так бы мовіць, марафонам гумару. Не стала выключэннем і Нацыянальная мастацкая ліга (НМЛ). Інтрыга цягнулася амаль што з вясны: усім было цікава, якія каманды пройдуць у фінал IV Рэспубліканскага турніру Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (НЦМТДМ) па гульні КВЗ «Нацыянальная мастацкая ліга». За права называцца фіналістамі змагаліся сем студэнцкіх каманд з розных універсітэтаў і гарадоў.

Дзіўная справа: ці то гледачы так знудзіліся па камандах, ці то каманды так прадуктыўна правялі лета, але ўзровень гульні быў сапраўды высокім. Не сталі перашкодай нават тэхнічныя непаладкі...

Паводле вынікаў усіх іспытаў журы назвала чатырох фіналістаў. Імі сталі каманды з БДУ «Спакваля», «Спадар Баршчэўскі», «Бойля-Марыёта», а таксама каманда з Кобрына «Чайка». Зусім хутка ім зноў давядзецца сустрэцца. Толькі тады будзе вырашацца, хто з іх стане пераможцам Нацыянальнай мастацкай лігі.

Пагутарыць пра куміраў у КВЗ, стварэнне жартаў і многае іншае мы дамовіліся менавіта з камандай «Чайка», якая ў паўфінале заняла першае месца. «Чайка» — гэта пяць маладых хлопцаў: Антон Заляшчук, Сяргей Ляўчук, Уладзімір Паруноў, Уладзімір Амельянюк і Андрэй Касцючук.

— Дык ці ёсць у вас куміры ў КВЗ?

Антон Заляшчук: — У кожнага з нас свае, і іх шмат. Часта захапляемся акцёрскай ігрой, але ж стараемся не пераймаць чужыя «фішкі», а шукаем сваё.

Андрэй Касцючук: — Мне, напрыклад, падабаюцца каманды з эксперыментальным гумарам, якія не баяцца прыдумляць і рабіць нешта новае.

— Ці ёсць мэта выйсці на больш высокі ўзровень у гульні?

Андрэй Касцючук: — У нашай камандзе людзі падзяляюцца на тых, хто плануе, і тых, хто жыве сённяшнім днём. Але наша асноўная мэта — трапіць на фестываль КВЗ у Сочы, а пасля — у Цэнтральную міжнародную лігу.

Антон Заляшчук: — У любым выпадку кар'ера пачынаецца з гэтага фестывалю. Зараз мы прымаем удзел у розных лігах, атрымліваем вопыт, напрацоўваем матэрыял, эксперыментуем. Усё гэта багаж, які ў далейшым нам дапаможа.

— Раскажыце, з якімі цяжкасцямі даводзіцца сутыкацца маладой камандзе?

Уладзімір Паруноў: — Прасоўванне маладой каманды — гэта праблема, бо ў рэгіянальных, міжрэгіянальных ці цэнтральных лігах трэба плаціць узносы. Напрыклад, паўфінал у Палескай лізе мы прапусцілі таму, што нам не выдзелілі грошы. Раней нам дапамагалі ў нашым родным горадзе. Зразумела, што студэнты не могуць самі сябе забяспечваць настолькі, каб плаціць немалыя ўзносы. А ёсць яшчэ выдаткі на харчаванне, дарогу, пражыванне. Таму вельмі складана менавіта ў фінансавым плане.

Уладзімір Амельянюк: — Але ж гэта ўсё кампенсуецца тымі эмоцыямі, якія мы атрымліваем, калі выходзім на сцэну, а таксама тым часам, які праводзім за стварэннем жартаў і мініяцюр.

— Цікава, а як яны ствараюцца?

Уладзімір Амельянюк: — Мы проста назіраем, што адбываецца вакол нас. Калі гэта смешна, спрабуем паказаць тое на сцэне. Амаль усё, што мы паказваем, насамрэч адбываецца ў нашым жыцці.

Антон Заляшчук: — Бывае, што «жыццёвыя» мініяцюры мала напоўнены тэкставымі жартамі...

Сяргей Ляўчук: — Але гледачы іх пазнаюць, бо сустракалі нешта падобнае ў сваім жыцці. Часта рэдактары нам гавораць: «Іграеце вы сапраўды добра, але ж няма тэкставага гумару».

Уладзімір Паруноў: — Часам мы дзелімся на дзве каманды, прыдумляем тэмы і на іх спрабуем смешна пажартаваць. Пасля свае мініяцюры паказваем адзін аднаму. Тое, што падабаецца ўсім, мы і паказваем на выступленнях. Часцей за ўсё ідэі прыходзяць спантанна.

Сяргей Ляўчук: — Не рэдкасць, калі мы ўбачылі нешта на вуліцы і адразу пачынаецца: «Хлопцы, а ўявіце сабе такую мініяцюру...»

Уладзімір Амельянюк: — Дарэчы, трэба як-небудзь пажартаваць, як у нас бяруць інтэрв'ю...

Вольга ШЫЛАК,
студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
20 11 2014 г.

Твой горад

Ці была ў вас калі-небудзь магчымасць убачыць Мінск з заплюшчанымі вачыма? Калі не, то менавіта гэтая экскурсія можа вас зацікавіць. Што можна «разглядзець» такім чынам, што новага даведацца пра Мінск у цемры, нам раскажа экскурсавод Людміла СКРАДАЛЬ.

НА ПАВЕТРЫ І З ЛЮДЗЬМІ,

або Як «адкрыць» турыстам вочы

Людміла Скрадаль.

— У экскурсіі «З заплюшчанымі вачыма» ёсць адно істотнае адрозненне: мы прапануем турыстам шчыльныя павязкі. А потым экскурсавод праводзіць іх па плошчы Свабоды. Мы дакранаемся да будынкаў, да малых архітэктурных формаў, адчуваем святло і цень, подых ветру, гукі, пахі горада — усё тое, што на звычайнай экскурсіі, як правіла, не заўважаем. Гэтая экскурсія падыходзіць абсалютна для ўсіх. Абмежаванняў няма. Гэта могуць быць і падлеткі, і пажылыя грамадзяне, і людзі з аслабленым зрокам. Уласна кажучы, усё распачалося з ідэі праводзіць паўнавартасныя экскурсіі для невідушчых людзей.

Першы маршрут пачынаецца ад ратушы, а другі звязаны з былым уніяцкім манастыром. Для экскурсіі створаны тактыльныя макеты, якія дазваляюць «убачыць» будынак у паменшаным маштабе, гэта значыць, мы можам «пабываць» на назіральнай пляцоўцы ратушы або на даху касцёла. Другая праграма праводзіцца з дапамогай інтэрактыўнага макета, які сам пра сябе распавядае, а экскурсавод у гэты час падтаквае. Атрымліваецца вельмі цікава, турыстам гэта вельмі падабаецца.

Як Эйнштэйн, сапраўдны доктар Айбаліт і першая расійская імператрыца звязаны з Мінскам? Пра гэта вы можаце даведацца падчас экскурсіі «Сусветна вядомыя людзі Мінска». А больш падрабязна пра яе нам паведаміць экскурсавод Юлія Валасатава.

— Экскурсія даволі незвычайная, таму што нічога падобнага да гэтага часу яшчэ не было. Размова на ёй ідзе пра сусветна вядомых людзей, якія нарадзіліся тут ці былі неяк звязаны з нашым горадам і з нашай краінай. Напрыклад, Альберт Эйнштэйн, мог стаць прафесарам у Беларусі. Цяпер можна толькі гадаць, як бы склаўся яго лёс, калі б ён прыехаў у наш горад. У Мінску нарадзіўся і Луіс Маер — заснавальнік кінакампаніі Metro-Goldwyn-Mayer, фільмы якой мы ўсе з дзяцінства любім. Ёсць версія, што менавіта ў Мінску нейкі час жыў і працаваў бацька Кацярыны I — расійскай імператрыцы.

Падчас экскурсіі мы наведваем плошчу Незалежнасці, дзе знаходзяцца галоўныя карпусы БДУ, у якіх мог працаваць Альберт Эйнштэйн, потым — Кастрычніцкую плошчу: і там, на думку гісторыкаў, знаходзіўся дом, дзе калісьці працаваў бацька Кацярыны I. Паказваем карпусы цяперашняй гарадской бальніцы: там некалі прымаў пацыентаў доктар — прататып легендарнага казачнага Айбаліта. Наведваем і набярэжную Свіслачы — маляўнічае, прыгожае месца, якое «падказвае», як жа быў звязаны Аляксандр Сяргеевіч Пушкін з Мінскам і Беларуссю.

«Альберт Эйнштэйн мог стаць прафесарам у Беларусі. У Мінску нарадзіўся і Луіс Маер — заснавальнік кінакампаніі Metro-Goldwyn-Mayer, фільмы якой мы ўсе з дзяцінства любім».

...А яшчэ яны ладзяць экскурсію «Гісторыя мінскай падземкі». Ідэя яе стварэння нарадзілася раптам. Аказваецца, у мінскім метро неаднаразова здымалі фільмы, у тым ліку і амерыканскі «Землятрус». Знайшоўшы некаторыя кадры ў інтэрнэце, можна сапраўды ў гэтым пераканацца. У мінскім метро, дарэчы, хацелі здымаць і нашумелы фільм «Метро 2033», але з-за выбуху на «Кастрычніцкай» выбралі іншы горад.

Цікава даведацца, дзе метро пачыналася, чым адрозніваюцца новыя станцыі. І, вядома ж, напрыканцы пачуць гісторыю-легенду пра апошні цягнік, у які непажадана садзіцца, таму што ёсць рызыка... ездзіць у метро да канца свайго жыцця.

А падчас экскурсіі «Таямнічы Мінск» самым запамінальным, на думку турыстаў, з'яўляецца наведванне касцёла Святога Роха. Тут, мабыць, спрацоўвае фактар нечаканасці: заходзіш у двор, падавалася б, самага звычайнага дома, а перад табой паўстае касцёл.

Я вельмі люблю такія містычныя экскурсіі, таму што людзей заўсёды цікавяць легенды, загадкавыя гісторыі, нейкія таямніцы...

Алена БІРУКОВА,
студэнтка II курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

Веру — не веру

УСЯ ПРАЎДА АБ АНГЛІЧАНАХ... І ТРОХІ МІФАЎ

«...Ён уяўляў сабой характэрны брытанскі тып. Выглядаў абыякавым і не любіў шмат гаварыць», — гэтымі словамі Уінстан Чэрчыль, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі, ахарактарызаваў тыповага суайчынніка. А вось у мяне склалася аб англічанах трохі іншае ўражанне. Нядаўна пашанцавала пабываць у Англіі, дзе ў перапынках паміж экскурсіямі я старанна вывучала характар, звычаі і традыцыі мясцовых жыхароў. У гэтым мне вельмі дапамагла сям'я Сміт, у якой я гасціла падчас знаходжання ў Лондане. Сям'я была самай звычайнай: мама, тата і трое дзяцей. Вядома, нельга меркаваць па адной сям'і адразу пра ўсю нацыю, але, пражыўшы тут усяго пяць дзён, я паспела заўважыць, што не ўсё ў Смітаў адпавядае традыцыям. Прапаную на іх прыкладзе развеяць некаторыя міфы аб англічанах!

НА СНЕДАННЕ — АЎСЯНКА?

МІФ. Хутчэй за ўсё, у з'яўленні гэтага міфа трэба вінаваціць фільм пра Шэрлака Холмса і знакамітую фразу з яго: «Аўсянка, сэр!» Вы, напэўна, таксама ведаеце мноства інтэрпрэтацый на гэтую тэму, аднак аўсяная каша ніводнага разу не з'явілася ў Смітаў на стале падчас снедання. Затое можна было паспрабаваць традыцыйны англійскі тост з мармеладам. Так, менавіта з мармеладам, які знаходзіцца ў маленькім слоічку, а на выгляд і на смак вельмі нагадвае звычайны джэм. Але адрозніваецца ад яго тым, што намазваць мармелад на хлеб нязручна і амаль што немагчыма. Аднак традыцыя ёсць традыцыя!

ГАРБАТА — ВЫКЛЮЧНА З МАЛАКОМ

МІФ. Увесь рытуал складаецца з таго, што трэба закінуць чайны пакецік у кубак і заліць яго кіпенем. Менавіта так рабіла місіс Сміт. Можа быць, у той дзень яна проста спазнялася на працу і не паспела наліць малако? Або малако скончылася? Не. Думаю, місіс Сміт проста любіць піць гарбату без яго.

ЗАХАПЛЕННЕ САДАВОДСТВАМ

ПРАЎДА. Нягледзячы на невялікі памер, участак зямлі ў Смітаў добраўпарадкаваны. Кожную раніцу хто-небудзь са старэйшых членаў сям'і абавязкова паліваў клумбы з нарцысамі і маленькі агародзік, дзе раслі два-тры агуркі, якія місіс Сміт з гонарам і замілаваннем называла «сваім ураджаем».

АНГЛІЧАНЕ — ГАНАРЫСТЫЯ І ЭГАІСТЫЧНЫЯ

50/50. Казаць гэтак пра Смітаў было б няветліва, бо яны сустрэлі мяне вельмі гасцінна. Са мной Сміты сапраўды былі прыязныя, міла ўсміхаліся, але, як мне здаецца, толькі для таго, каб пакінуць пра сябе добрае ўражанне. Зараз паспрабую растлумачыць.

Па-першае, дзеці ставіліся да мяне абыякава, што было дзіўным: у іх доме жыве чалавек, які прыехаў з іншай краіны, а яны не звяртаюць на яго ніякай увагі, займаюцца сваімі справамі. Па-другое, члены сям'і рэдка размаўлялі нават паміж сабою. Маглі абмяняцца некалькімі словамі аб надвор'і або па іншых банальных тэмах (дарэчы, тое, што англічане ўвесь час кажуць пра надвор'е, таксама чыстая праўда). Кожнае дзіця штосьці рабіла ў сваім асобным пакоі, а бацькі моўчкі глядзелі тэлевізар.

У ІХ АСАБЛІВЫ ТОНКІ ГУМАР

50/50. Складана сказаць, праўда гэта ці міф. Сміты часам смяяліся пасля якой-небудзь сваёй жа фразы, аднак ніякіх жартаў я не чула. Магчыма, гэтак адбывалася з-за недастатковага валодання мовай або проста гумар быў настолькі тонкім, што я, на жаль, не змагла яго зразумець.

Наогул, вельмі часта англійскі гумар складаецца з гульні слоў. Ёсць рэчы, якія проста немагчыма перакласці з англійскай мовы, таму нам складана зразумець сэнс таго ці іншага анекдота. Вось, напрыклад:

— У нашым горадзе жыве вельмі буйная дама. Яна носіць сукенкі 16-га памеру. Я ведаў яе, калі яна была маладой і ў яе быў значна меншы памер.

«Кожную раніцу хто-небудзь з сям'і абавязкова паліваў клумбы з нарцысамі і маленькі агародзік, дзе раслі два-тры агуркі, якія місіс Сміт з гонарам і замілаваннем называла «сваім ураджаем».

— Чаму вы думаеце, што цяпер яна носіць 16-ы?

— Я думаю, яна проста «8+8».

«Калі я зайшла ў дом Смітаў, мне падалося, што я трапіла ў палац Снежнай Каралевы. У той час тэмпература на вуліцы вагалася ад 0 да 2 градусаў цяпла. У памяшканні было тое ж самае».

Пасля такога анекдота хочацца адразу абвінаваціць англічан у нецікавых жартах. Аднак на іх мове «8+8» гучыць як «ate and ate», што перакладаецца «ела і ела». Думаю, зараз вы ўсміхнуліся!

БАТАРЭІ ЎКЛЮЧАЮЦЬ У РЭДКІХ ВЫПАДКАХ

ПРАЎДА. Калі я зайшла ў дом Смітаў, мне падалося, што я трапіла ў палац Снежнай Каралевы. У той час тэмпература на вуліцы вагалася ад 0 да 2 градусаў цяпла. У памяшканні было тое ж самае. Англічане і не думалі тапіць, а камін, які стаяў у гасцінай, напэўна, з'яўляўся ўпрыгажэннем традыцыйнага інтэр'ера. Апрануўшы адначасова два світары і ахінуўшыся коўдрай, я са здзіўленнем назірала, як члены сям'і выходзяць на прагулку ў лёгкіх штанах і ў звычайных футболках, накідваючы зверху пінжачок; назірала, як яны мыюць рукі пад струменем халоднай вады. Дарэчы, пра ваду асобная гісторыя.

У адрозненне ад нас, у англічан не адзін агульны кран для гарачай і халоднай вады, а два. У першым вада халодная, у другім — гарачая. Гэтая традыцыя жыве ў краіне даўным-даўно, і мала хто яе парушае. Таму кожны раз, калі я ўваходзіла ў ванны пакой, у мяне быў выбар: апячы рукі ці змерзнуць яшчэ больш. Аднак паўтараю: традыцыя ёсць традыцыя!

АНГЛІЧАНЕ ВЕЛЬМІ ПУНКТУАЛЬНЫЯ

МІФ. Увечары містар Сміт павінен быў забіраць мяне з экскурсій роўна ў сем. Пунктуальнасць у яго зусім адсутнічала. Ён спазняўся на паўгадзіны. А я ж не такая загартаваная, як ён, і мне даводзілася мерзнуць на англійскім холадзе. На жаль, стрэлкі Біг-Бэна містару Сміту не дапамагалі...

ЯНЫ ВЕЛЬМІ ЛЮБЯЦЬ ЖЫВЁЛ

50/50. У інтэрнэце я знайшла даволі цікавую статыстыку: амаль у шасці мільёнаў англічан у доме жывуць сабакі, у пяці мільёнаў — каты, а на трэцім месцы па папулярнасці знаходзяцца хвалістыя папугайчыкі.

Сміты, магчыма, і любяць сабак, але ў доме іх не трымаюць. Затое тут жывуць дзве цудоўныя рыбкі. Я нават запомніла іх імёны — Боні і Фрэд. Мне падалося, што яны выдатна сябе адчуваюць і з'яўляюцца паўнапраўнымі членамі сям'і. Цікава, а англійскія рыбкі адрозніваюцца ад нашых? Калі б у мяне было больш часу, я б абавязкова гэта высветліла!

Вось і ўсё. Я, нібы знакаміты Шэрлак Холмс, раскрыла ўсю праўду. Як вы самі бачыце, нельга падпарадкоўвацца стэрэатыпам. Усе людзі рознія, і таму жыць на свеце цікава!

Ганна ЯЎСЕЙЧЫК,
вучаніца 11 класа
гімназіі № 61 г. Мінска.
Фота аўтара.

Ноч для дваіх

ПРА ШТО ВЕДАЮЦЬ МУЗЫ?

Сёння Яна была побач. Прыйшла, як заўсёды, без папярэджвання. Я ўжо спаў, калі Яна пастукала ў дзверы — нясмела і зусім ціха. Яна заўсёды прыходзіць без папярэджвання і заўсёды розная: часам урываецца ў пакой, расхінуўшы шторы і раскідаўшы на стале спісаныя мною лісты, часам незаўважна пракрадваецца і садзіцца ў глыбокае крэсла ў кутку.

...Я зрабіў каву і сеў за стол. Адчуваў: сёння Яна нейкая асаблівая. Напэўна, таму, што мы ўжо даўно не бачыліся. Не ведаю, дзе Яна была ўвесь гэты час. Проста ў адзін дзень сышла, зноў жа без папярэджвання, і ў маім свеце стала занадта ціха і пуста без Яе. Раней мы праводзілі шмат часу разам. Асабліва ў дзяцінстве — тады мы не расставаліся ні на хвіліну. Я не ведаю, колькі Ёй гадоў, але адчуваю, што Яна расла разам са мной. Мы раслі, збіраючы кветкі ў поле, ловячы матылькоў, гуляючы басанож па мокрай ад расы траве. Мы разам вучыліся адчуваць: прыроду, навакольных людзей, боль, крыўду, прыхільнасць, гнеў, любоў. І галоўнае — вучыліся з гэтымі пачуццямі спраўляцца. Гэта Яна навучыла мяне марыць і фантазіраваць. Часам Яна сыходзіла, але нязменна вярталася. Я не мог без Яе, гэтак жа, як і Яна без мяне. Мы проста былі чымсьці суцэльным і непадзельным. Часам было больш мяне, часам верх над нашай агульнай свядомасцю брала Яна. І я быў не супраць. Я адчуваў: Яна — куды важней.

— Ведаеш, мне цябе не хапала, — пачаў я.

Яна не адказала. Яна ніколі не адказвала. Толькі ўсміхнулася і прыадчыніла акно, каб упусціць халаднаватае начное паветра і саму ноч у маю маленькую кватэрку. Вецер затушыў свечку на стале. Ну і няхай. Ён хутка сыдзе, я ведаю. Нават вецер не мог доўга заставацца ў гэтых чатырох сценах, ён кідаўся з кута ў кут, спрабуючы знайсці выхад, а потым знікаў, і вакол зноў было ціха. Я люблю вецер. Ён такі ж вандроўнік, як і я, толькі што больш свабодны і мудры. Ён здаецца някемлівым юнаком, гарэзам, але насамрэч ён куды разумнейшы за прафесараў. Тое, пра што яны распавядаюць, ён не толькі бачыў: сам развяваў плашчы рыцараў на турнірах, прыносіў палёгку і прахалоду невядомым нам плямёнам, хаваўся між соснаў, калі салдаты ішлі ў атаку... Маўклівы спадарожнік гісторыі, ён дакранаўся да рук і твару Неферціці, гуляў у валасах Кацярыны II. Калі ён злаваўся, то, як маленькае дзіця, разбураў усё запар, але потым абавязкова супакойваўся. Чалавецтву мільёны гадоў, а ў ветру няма ні ўзросту, не імені. Змяняліся пакаленні, кіраўнікі, рэлігіі, а вецер заставаўся ранейшым. Ён такі ж, якім бачыў яго мой дзед і мой бацька — вечна юны, вечна вольны, вечна самотны.

...Яна была са мной усю ноч, да самага світання. А калі ў пакой пракралася сонечнае святло, сышла, растварыўшыся ў дні, які надыходзіў... І зноў вакол было ціха і пуста. Я не ведаю, калі Яна прыйдзе зноў, але адчуваю, што гэта абавязкова здарыцца. Я буду чакаць. Кожную ноч буду шукаць Яе ў сваіх снах, днём — ва ўсмешцы выпадковага прахожага, у кроплях дажджу на шкле, музыцы, паміж старонак кніг. Яна побач, я ведаю.

...На стале ляжаў скончаны рукапіс. Як Яна даведалася, што патрэбна мне менавіта цяпер? А, зрэшты, Музы заўсёды гэта ведаюць.

Арына КАГАЛЁНАК, вучаніца 11 класа наваполацкай гімназіі №2.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Мелодыя сэрца

РУКАПІСНЫ РАДОК ЯК МАШЫНА ЧАСУ

Людзі. Імёны. Падзеі. Уражанні... Трэба ўсё прапусціць праз сябе, адчуць. Прыемны пах чарніла шарыкавай ручкі, якой выпісваеш радкі ў нататніку. Напэўна, ён патрэбны ўсім пісьменнікам-пачаткоўцам, ды і звычайным людзям таксама. Згадзіцеся, не ў кожнага ёсць чалавек, якому можна расказаць, што на самой справе ў цябе на душы. А выказацца часам так хочацца.

Ліст прымае ўсё: крыкі, слёзы, радасць, смех. Папера збірае пахі, пачуцці, эмоцыі... Таму я люблю атрымліваць лісты. Няхай звычайная пошта працуе больш марудна, чым электронная, але кожны ліст доўгачаканы і выклікае ўсмешку. У якасці адказу на яго проста так не наставіш «смайлікаў». У маім дзяцінстве былі сябры па перапісцы. Памятаю кожнага. Іх лісты і зараз ляжаць у скрынцы: не падымаецца рука выкінуць. Бывае, шукаеш нешта, і яны выпадкова трапляюцца на вочы. Возьмеш у рукі, не разгортваючы, і спрабуеш адгадаць, хто яго табе напісаў. Па почырку, малюнку, лёгкім водары парфумы. І думкамі вяртаешся ў той дзень, калі дастаў з паштовай скрыні канверт, акуратна адрэзаў край, каб не пашкодзіць само пасланне. Прыгадваеш, як чытаў, усміхаўся або сумаваў, як садзіўся пісаць адказ... Трымаеш у руках «машыну часу». Мне дзіўна, як адзін спісаны лісток вяртае цябе ў мінулае.

Адкрываеш нататнік, шукаеш чысты ад думак ліст. Першая фраза. Далей рукой ужо кіруе сэрца. Паступова думкі, пачуцці і падзеі ператвараюцца на паперы ў аповед. Калі яго прачытаць праз год — на твары ўсмешка. Праблемы, здавалася б, невырашальныя тады, сёння падаюцца простымі як двойчы два. Думаеш, чаму так адбываецца? Чаму мы пастаянна вяртаемся ў мінулае? Напэўна, для таго, каб зразумець, як важны кожны пражыты момант.

Натхненне да мяне прыходзіць, калі ў душы пажар, сэрца разрываецца, а сябры не размаўляюць. Менавіта тады мяне «выслухоўвае» папера. Каб пісаць, мне неабходна паглыбіцца ў сябе. Дапамагае музыка або адзінота. Пішаш, не адцягваючы ўвагу на ежу і тэлефон...

...Плыня думак абарвана, пачуцці ўжо на паперы. Выдыхаеш. Вяртаешся ў рэальнасць. У ёй нічога не змянілася. Як так? Бо толькі што ты жыў і адчуваў зусім іншы свет! Гэтак жа бывае пасля чытання кнігі ці прагляду фільма. Не проста так казаў Стывен Кінг, што апісанне пачынаецца ў пісьменніцкім уяўленні, а заканчваецца ў чытацкім. Праўда, фільм — трохі іншае. Рэжысёр прапаноўвае гатовыя вобразы, карціны і пачуцці. У фільме на дзею адводзіцца пара секунд, а ў кнізе — пяць старонак.

А што прыходзіць на змену натхнення? Пачуццё спустошанасці і фізічнага знясілення. Як выйсці з гэтага стану? Свет здаецца шэрым, якім, зрэшты, ён і з'яўляецца на самой справе. Мы ўсе — мастакі, мы самі размалёўваем свет. У кожнага з нас ёсць усе колеры вясёлкі, але малюнкі ва ўсіх усё роўна будуць рознымі...

Кацярына ЛЯСУН.

Друкуецца ў «Маладосці»

Кацярына МЯДЗВЕДЗЕВА — казачніца. Самая сапраўдная. Калі вы думаеце, што імі былі толькі Лагерлёф і Ліндгрэн, вам самы час чытаць «Разламашкі...» — каб старыя ўяўленні былі знішчаны дашчэнту. Упершыню Кацярына Мядзведзева выступала ў «Маладосці» ў «фантастычным» нумары з казкай «Спадарыня Трынога». Памятаеце? «Разламашкі...» вам таксама запомняцца.

Кацярына МЯДЗВЕДЗЕВА

РАЗЛАМАШКІ МАЙСТРА ЛЮФТА

Урывак з аповесці

ПРАФЕСАР гартаў уводзіны да Антонавага дыплома, і позірк яго рабіўся панурым.

— Даражэнькі, што за тэма? — сказаў ён нарэшце. — Я разумею, нікому не хочацца вывучаць музычныя скарбонкі, усім рэдкасці падавай. Я разумею, што разламашкі майстра Люфта — гэткая прыгожая казка, якая шмат каго натхніла паступіць менавіта да нас, у школу вытанчаных рамёстваў. Але ж і вы мяне зразумейце! У дыпломе павінна быць практычная частка: фатаграфіі, схемы, аналіз вытворчасці, распрацоўкі мадэлі. А калекцыя разламашак — і вы гэта ведаеце не горш за мяне — на выставы не вывозіцца, захоўваецца ва ўдавы майстра Люфта пад замком! Старая ашалела, нікога не пускае ў дом. На якім матэрыяле вы збіраецеся працаваць? Міфы і легенды нашага мястэчка? Старыя газетныя артыкулы ды чорна-белыя здымкі трыццацігадовай даўнасці? Вы праваліце дыплом!

— Але я напісаў мадам Люфт ліст з просьбай прыняць мяне! — горача запярэчыў Антон. — Упэўнены, яна не адмовіць. Я збіраюся пагасцяваць у яе і зрабіць фотаздымкі калекцыі, а таксама, з дазволу гаспадыні, падрабязна вывучыць дзве-тры разламашкі і апісаць іх.

— А маладзік з нябёсаў вы зададно не дастанеце? — пацікавіўся прафесар. — Ніколі яшчэ не бачыў такой саманадзейнасці. Майце на ўвазе, да аўторка ў вас ёсць час памяняць тэму дыплома. А потым я ад'язджаю на канферэнцыю, і ўжо тады выкручвайцеся як хочаце.

Антон забраў сшытак і выйшаў.

Зразумела, ён ведаў, што так і будзе: што яго высмеюць аднакурснікі ды скептычна паставіцца прафесар. Але ён ведаў і тое, што разламашкі былі зусім не вывучаны. Загадкавыя рэчы, якія на выгляд здаюцца нечым адным, а насамрэч з'яўляюцца зусім іншым. Ніхто не ўмеў іх рабіць, хоць усе марылі навучыцца. На чорным рынку за разламашку прапаноўвалі шалёныя грошы. Калекцыянеры дрыжалі над кожным экзэмплярам. І калі Антон збіраўся прысвяціць чамусьці сваё жыццё, дык гэта вывучэнню і стварэнню разламашак. Гэта вам не гадзіннікавы механізм сабраць са спружынак і шасцярэнек. Разламашкі — мастацтва, паэзія, мара!

ООО

НА дыванку пад дзвярамі Антона чакаў ліст. Ад мадам Люфт. Ён чытаў яго, калі ішоў у студэнцкую сталоўку, і яго твар усё больш хмурнеў.

«Сябручок, — было напісана там мудрагелістым почыркам. — Дом майстра Люфта — не гасцініца для студэнтаў, а таксама не музей. Вашу просьбу вымушана адхіліць. З павагай, мадам Люфт».

— З павагай, — прамармытаў Антон. — З павагай...

— Антон! — да хлопца падсела яго аднакурсніца Юлія.

Вочы ў страуса большыя, чым яго мозг. Пра Юлію можна было смела казаць тое ж самае. Мабыць, за прыгожыя вочы яе і трымалі ў школе. Іншых прычын Антон не ведаў, таму што вучылася дзяўчына вельмі дрэнна.

— Чаго зажурыўся? Благія весткі? — спытала яна на здзіўленне зацікаўлена.

— Ды ўжо ж, — прамармытаў ён.

— Знаёмы почырк, — прагаварыла Юлія. Выхапіла ліст, прабегла вачамі. — Вой, толькі не кажы, што ты сур'ёзна вырашыў заняцца Люфтавымі разламашкамі!

— Аддай! — ускінуўся Антон. — Чым хачу, тым і займаюся. Што тут такога?

— Ды нічога асаблівага, — яна паціснула плячамі. — Гэта свайго роду благая традыцыя. З года ў год у школе знаходзяцца дзівакі, якім падавай міфічныя разламашкі міфічнага Люфта. Усімі спосабамі яны спрабуюць пракрасціся ў дом засмучанай удавы, каб на свае вочы ўбачыць калекцыю. І, што самае цікавае, пасля гэтага яны ніколі не вяртаюцца ў школу. Адны з глузду з'язджаюць, другія трапляюць у турму за спробу крадзяжу з узломам...

— Адкуль такая дасведчанасць? — спытаў Антон хмура.

— Ды, ведаеш, — яна агледзелася па баках, — са згоды дырэкцыі я вучуся тут пад выдуманым прозвішчам. А насамрэч майстар Люфт даводзіўся мне родным дзедам. І на выхадныя я ад'язджаю туды, дзе «не гасцініца і не музей». Да маёй ненагляднай бабулі з дзівацтвамі.

Антон разявіў рот.

— І што вы ўсе знаходзіце ў дурных дзядулевых забаўках? — прагаварыла Юлія задуменна. — Барахло барахлом. Для мяне дык каралі з чорных перлін ці брыльянтавыя дыядэмы — значна цікавей.

— Ты бачыла разламашкі? Можа, і ў руках трымала? — недаверліва спытаў Антон.

— Само сабой, — кіўнула яна. — Не разумею, што ў іх асаблівага. Размаляваныя дзеравякі ды бляшанкі. Дзецям, можа, такое і цікава. А дзяўчаты накшталт мяне аддаюць перавагу даражэйшым цацкам.

— Юлія! — Антон учапіўся ў яе. — Юлія!

— Не працягвай, у мяне адкрылася здольнасць да тэлепатыі, — усміхнулася яна. — Прапаную абмен. Ты пішаш за мяне дыплом па каралях з перлін усходніх мораў, а я бяру цябе на выхадныя ў дом бабулі Люфт.

— Ды я напішу сто дыпламоў за мажлівасць дакрануцца хоць да адной разламашкі! — усклікнуў Антон. — Але скажы, твая бабуля... не будзе лаяцца, калі ты прыедзеш дахаты не адна? Гэта прыстойна?

— Што-небудзь прыдумаем, — Юлія зірнула на ручны гадзіннічак. — На тваім месцы я б не расседжвалася. Бібліятэка закрываецца ў восем, а я заўтра павінна паказаць выкладчыку першы раздзел.

ООО

ЖЫЛЛЁ майстра Люфта было падобна да легендарных разламашак. Нязграбны, рознакаляровы, дзівакаваты дом з мноствам вежак, мансард, флюгераў і, невядома для чаго, з байніцамі. Мабыць, каб адстрэльвацца ад дакучлівых прыхільнікаў. Кутняе акно на другім паверсе было забрана кратамі. Хутчэй за ўсё, менавіта там жыла бабуля Люфт у абдымку з каштоўнай калекцыяй. У акне па суседстве курыла прыгожая брунетка няпэўнага ўзросту. А ў акенцы мезаніна сядзела дзяўчынка з коскамі і пускала мыльныя бурбалкі.

— Мая стрыечная сястра Кіра, — буркнула Юлія. — На рэдкасць надакучлівае стварэнне. Тая, што паліць, — яе маці Аліна. Дужа з'едлівая асоба. Не прымай яе словы на веру, гэта істэрыка па сыходзячай маладосці. Імкніся клікаць яе па імені, за «цётку» можа аплявуху ўляпіць. І ў цэлым, не надта звяртай увагу на маё сямейства. Тут усе з дзівацтвамі.

Дзверы ім адчыніла сама бабуля Люфт. Далікатная сталая лэдзі ў іскрыстай чорнай сукенцы. На шыі ў яе вісеў масіўны залаты ключ, аздоблены дыяментамі. Не горш за дыяменты пабліскваліі бабуліны вочы, калі яна расцалавала спачатку Юлію, потым Антона, чаму апошні вельмі здзівіўся.

— Дзеці мае, як я рада, — прагаварыла яна, бадзёра страсянуўшы сівымі кудзеркамі. — Чысціце пёркі, пераапранайцеся. Праз паўгадзіны — вячэра.

Бабуля віртуозна развярнулася на высокіх абцасах і накіравалася ў глыб дома. Толькі цяпер Антон заўважыў, што яе суправаджаў чорны калматы сабака, памерам з дарослую авечку...

SEX=БАЛЯСЫ

ЧАМУ ЗДРАДЖВАЮЦЬ МУЖЧЫНЫ?

Паспрабуйце спытаць пра тое ў лоб любога прадстаўніка моцнай паловы чалавецтва. Што пачуеце? Правільна, у лепшым выпадку, нічога. У горшым — вам ваша і вернецца. У той самы лоб у прамым сэнсе слова. Хібы толькі які запісны казанова, заціснуты ў кут уласнай жа рэпутацыяй і ўзгадаваным на ёй гонарам, напэўна, скажа прыкладна так, як на пытанне пра яго буйны нораў адказаў Партос з «Д'Артаньяна і трох мушкецёраў»: «Я б'юся таму, што я... б'юся!»

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

А ўсё чаму? Ну хто ж будзе здаваць адрасы, паролі, яўкі і патаемную сцежку на «дальні кардон»! Але вось нагода не пераходзіць на асобы, а зірнуць на сітуацыю збоку, — новае даследаванне навукоўцаў на тэму «Чаму здраджваюць мужчыны». Не, не ўсюдыісных брытанцаў, а індыйцаў. Хаця... Калі прыгадаць, што Індыя яшчэ адносна нядаўна была, прабачце, калоніяй Вялікабрытаніі, пра ўсюдыіснасць некаторых мы не памыліліся зноў. А тое, што свой уклад у раскрыццё «таямніц» паміж паламі паспрабавалі ўнесці менавіта індыйцы, толькі надае даследаванню асаблівай пікантнасці, пра якую потым.

Дык вось, дзякуючы даным новага апытання эксперты «ўстанавілі», што часцей за ўсё мужчыны здраджваюць сваім жонкам або сардэчным сяброўкам з-за таго (такіх ажно 24 працэнты налічылі), што іх партнёрак не цікавіць (увага!)... секс. (Вось дык «здзівілі»! Не, ён пайшоў «налева» таму, што не спадабаўся колер лаку на яе пазногцях! У знак пратэсту!) Сямёна Слепакова памятаеце з яго песняй «Да вяселля нельга»? *«А ты сказала: извини, но до свадьбы никак./ Что тебе очень жаль, но до свадьбы никак./ А после на диване, на тумбочке и в ванной./ На пляже и в машине, за шторкой в магазине,/ А до свадьбы — никак!» І герой адказвае, што пойдзе да Марыны («У неё была свадьба в прошлом году»), таму што «А я хочу до свадьбы, а я хочу до свадьбы../ Сегодня, сейчас»*. Заўважце, яшчэ да вяселля. Таму што, як спявае той жа аўтар далей, «А я сказал: после свадьбы бывает у всех,/ После свадьбы, естественно, будет у нас.../». А вы кажаце... галава баліць. А трэба ж як? «Сяброўка сказала, што ў ложку трэба быць непрадказальнай. І вось падчас сексу я дастала... бубен!»

На другое месца індыйскія даследчыкі прычыны мужчынскай здрады паставілі пастаянныя сваркі і спрэчкі. (Адэская сямейная «разборка». «Ціля, я цябе малю — давай развядземся! У мяне ўжо сіл больш няма так жыць!» — «Не, Яша, удавой узяў — удавой і пакінеш...») Менавіта гэта прымушае хадзіць «налева» 18 працэнтаў мужчын. І вось тут у мяне ўзнікае пытанне пра тую самую пікантнасць... Сваркі і спрэчкі ў жыхароў краіны, якая дала свету «Камасутру», на мой погляд, могуць мець толькі адно тлумачэнне. Калі партнёры разыходзяцца ў меркаваннях, з якой старонкі «пачаць»! («Чаму ў вас посуд пабіты?» — «Сварыліся» — «А чаму канапа паламаная?» — «Мірыліся»). Інакш мне гэта нагадвае анекдот пра рафінаванага інтэлігента, які, маючы пад рукой пераклдны каляндар, пакутуе ад адсутнасці нагоды падняць тост. Памятаеце, як дзед Міця з «Кахання і галубоў», зірнуўшы ў яго, са шкадаваннем прамовіў: «О, дзень узяцця парыжскай Бастыліі прайшоў дарэмна».

Няўрымслівыя навукоўцы падлічылі, што для 15 працэнтаў мужчын нагода здрадзіць другой палавінцы з'яўляецца пасля таго, як тая пачынае занадта кантраляваць іх і абмяжоўваць свабоду. («У жанчыны няма правілаў, ёсць настрой. Які настрой — такія і правілы». Хаця «ўрачы-рэнтгенолагі не лічаць, што ўнутраны свет жанчын вельмі складаны і нейкі асаблівы»). Ведаеце анекдот у тэму, які для некага, можа, і сапраўды з'яўляецца не гумарам, а прозай жыцця? Тэлефануе муж дадому пасля працоўнага дня і кажа: «Любая, не чакай мяне сёння рана. Мы вырашылі сустрэцца з сябрамі, пасядзець у бары» — «Што ты сказаў? Паўтары!» — «Я кажу, што вельмі сумую па табе і хутка буду». Мудрэйшымі ж трэба быць! Вы ведаеце, што калі мужчына чатыры разы сходзіць «налева», дык, па законах геаметрыі, ён вернецца дадому? Жартую, канешне, але навошта адразу да такога даводзіць? Можна і прасцей зрабіць. «Дарагая, а давай зробім адно для аднаго выдатныя выхадныя?» — «Ой, канешне, каханы!» — «Ну, тады да панядзелка!» Гэта я пра рыбалку, напрыклад. А вы пра што падумалі?

Нарэшце, 12 працэнтаў выпадкаў адзюльтэру з боку мужчын адбываецца ў сувязі з тым, што жанчыны патрабуюць надаваць ім зашмат увагі. («Жанчына, у прынцыпе, можа і памаўчаць. Але справа ў тым, што ў жанчыны няма такога прынцыпу»). Вынік? Напачатку будзе як у чарговым анекдоце. Жонка кажа сужэнцу, які на канапе чытае газету: «Ды перастань ты мне падтакваць! Я ўжо паўгадзіны з табой не размаўляю!» А потым — да Марынкі (памятаеце, «у неё была свадьба прошлом году»)...

...У рэшце рэшт, у гэтым даследаванні, як падаецца, нейкія працэнты і паслядоўнасць названых або неназваных прычын здрады ніякай ролі не адыгрываюць. Галоўная выснова відавочная і банальная: жанатыя мужчыны (як і замужнія жанчыны) шукаюць у іншым месцы тое, што не атрымліваюць ад сваіх партнёраў. Можа, варта зноў пачуць адно аднаго? Вось мы ж ведаем, наколькі небяспечна засоўваць палец у «актывізаваны» заручальны пярсцёнак. Ведаем, але ўсё роўна ўсоўваем, калі вы паманіце за сабой. Памятаеце, як робіць сапраўдная жанчына? Спадабаўся мужчына — падышла, узяла хлеба, хуценька каўбаскі падрэзала, баршчу наліла, сказала: «Што на заўтра гатаваць?» Усё. І ні ў каго ні аб чым галава не баліць...

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Мае адносіны з агнём ужо не рамантычныя»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Няўжо вас бацька не вучыў бараніцца?

— Мае бацькі — інтэлігенцыя ў трэцім пакаленні, выкладчыкі. Таму з малых гадоў я зачытваўся кнігамі. Быў такім тыповым «добрым хлопчыкам», якога выхоўвалі паслухмяным, ціхім і сціплым. Пазней, у студэнцкія гады, мне давялося «змагацца» з гэтымі рысамі характару.

— А потым пачалі займацца сярэднявечным тэатрам і ладзіць агнявыя шоу, адкрылі школу ірландскіх танцаў...

— У нас тады не было нічога падобнага. А мной кіравала цікаўнасць, мы «фанацелі» ад гэтай працы. Таму і занялі пустую нішу. Да таго ж гэта мела водгук у маёй душы. Так адбывалася спачатку з тэатрам, потым з ірландскімі танцамі. Калі колькасць школ дайшла да шасці, я зрабіў з танцаў хобі, а вось сярэднявечны тэатр — і сёння з'ява ўнікальная. Гурт кшталту нашага ёсць толькі ў штаце Пенсільванія ў ЗША, а ў Еўропе такіх, як мы, не сустрэнеш.

«Апошнім часам для мяне танец з агнём — гэта ўжо руціна, кшталту гатавання ежы. У тэхнічным плане агнём я карыстаюся як элементам перфоманса. І ўсё разам для мяне з'яўляецца рамяством, таму агню я не баюся».

— Ці складана скарыць агонь?

— Тэхнічна пакарэнне агню патрабуе трэніровак, працы над сабой і развіцця сілы волі. А пераадоленне страху перад ім для мяне зводзіцца менавіта да сілы волі. Бо яна дазваляе чалавеку выкаваць свой характар, як кавалю падкову, і дасягнуць жаданых вынікаў. Апошнім часам для мяне танец з агнём — гэта ўжо руціна, кшталту гатавання ежы. У тэхнічным плане агнём я карыстаюся як элементам перфоманса. І ўсё разам для мяне з'яўляецца рамяством, таму агню я не баюся. Цяпер мае адносіны з агнём ужо не рамантычныя, бо мы добрыя знаёмыя. І я яго вельмі паважаю.

— Колькі часу патрабуецца для рэпетыцый?

— Дзве гадзіны ў дзень. Столькі часу мінімальна патрэбна чалавеку, які мае цікавасць і хоча дасягнуць поспеху ў сваёй справе. Калі ж, напрыклад, нехта будзе трэніравацца 56 гадзін у месяц, але на працягу трох-чатырох дзён запар, то поспех, на мой погляд, малавераго дны, а вось стомленасць гарантавана...

— Як часта вы абнаўляеце рэпертуар?

— Сёння працуем над вяртаннем да святлодыёднага шоу. Мы фактычна скончылі фарміраванне сярэднявечнага тэатра, таму будзем вяртацца да ранейшых праектаў. Аднак цяпер гэткіх шоу багата, таму нас чакае моцная канкурэнцыя.

— Наведваючы розныя фестывалі, назіраючы за чужымі выступленнямі, ці бачыце агульную карціну таго, што адбываецца з тэатрамі кшталту вашага? Наколькі складана сёння здзіўляць гледача?

— Цяпер вельмі папулярны хобі-цырк: калі чалавек мае працу з добрым заробкам, а ў вольны час трэніруецца, каб здзівіць сваіх сяброў, знаёмых, паехаць некуды з выступленнямі і яму не патрэбны ганарар. Яшчэ я адзначу існаванне асобных жанраў сцэнічнага мастацтва, якія патрабуюць не шмат часу для прапрацоўкі, што робіць іх папулярнымі. Можна пашыць сабе добры строй, навучыцца круціць тэнісныя шарыкі на ланцужках — і ты ўжо можаш зарабляць. Гэта прафанацыя, і з часам яна знікне. Як выкладчык Школы агнявых мастацтваў я бачу, як людзі, якія вывучылі базавыя элементы, здзіўляюцца, што іншыя, ведаючы толькі пачатковы ўзровень, ужо лічаць сябе артыстамі агню. А можна ж прасунуцца далей, больш працаваць, практыкаваць перфомансы, і толькі потым выступленне стане годным. І самае сумнае, што публіка «вядзецца» на аматараў...

— Колькі часу спатрэбілася, каб перавесці хобі ў прыбытковую справу?

— Мы зразумелі недзе праз два гады, што нашай справай трэба займацца на іншым узроўні. Назіраючы не толькі за сабой, я зрабіў выснову: чалавек шчыльна можа займацца нечым менавіта такі тэрмін. За гэты час ён паспявае зразумець, ці можа занятак быць прыбытковым і ці не страчаны былы энтузіязм. Потым ён ужо вырашае: ці займацца гэтым на прафесійным узроўні або пераключыцца на нешта іншае.

«Тэхнічна пакарэнне агню патрабуе трэніровак, працы над сабой і развіцця сілы волі. А пераадоленне страху перад ім для мяне зводзіцца менавіта да сілы волі».

— З нараджэннем сына ваша стаўленне да творчасці і да жыцця змянілася?

— Безумоўна, я стаў больш прагматычным. Цяпер я не магу дазволіць сабе ўсё кінуць і паехаць падарожнічаць аўтастопам. Для мяне больш важна, каб у першую чаргу добра было сыну, а не мне. Гэта датычыцца і аплаты маёй працы, і абмежаванняў у творчасці, бо сёння я не пайду на авантуру — выступіць на фестывалі проста таму, што ён мне цікавы...

— І чаго цяпер не хапае ў жыцці?

— Мне не хапае 300 тысяч долараў. На сто я купіў бы дом, сто паклаў бы ў банк, а на сотню адправіўся б вандраваць з сям'ёй... Можа, супакоіўся б на нейкі час. А калі б засумаваў, дык глядзеў бы па сітуацыі. Аднак усяго, што мне патрэбна, я так ці інакш дабіваюся. Проста каб зарабіць такую суму, неабходны час. Магчыма, калі грошы з'явяцца, то зменіцца ўжо маё стаўленне да іх. Але фактычна я ўсяго дабіўся!

Алена ДРАПКО.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар-галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА, рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 19.679.
Нумар падпісаны ў 19.30 19.11.2014 г.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

У канцы сямідзясятых — першай палове васьмідзясятых песня «Клён» была настолькі папулярнай сярод тагачаснай моладзі ды падлеткаў, што і сёння можна было б праводзіць конкурс на лепшую гісторыю-ўспамін, так ці інакш звязаную з ёй. Зрэшты, тэма ў мастацкім творы, усё-ткі, не самае галоўнае. Прынамсі, часцей за ўсё. Аднойчы Чэхаў спытаў у Караленкі: «Ведаеце, як я пішу свае кароткія апавяданні?». Ён узяў са стала першую рэч, якая трапіла пад рукі. Гэта была попельніца. Пасля гэтага сказаў: «Хочаце — заўтра будзе апавяданне. Назва — «Попельніца».

Несумненна, і ў апавяданні Валерыя Гапеева дэталь з пласцінкай, на якой запісаны «Клён» у выкананні ансамбля «Сіняя птушка», не самая важная. Аднак жа, пакуль чытаў яго, песня ўвесь час гучала ў галаве…

Алесь БАДАК.

Валерый ГАПЕЕЎ

ТАМ, ДЗЕ КЛЁН ШУМІЦЬ...

КАЛІ б у мяне быў конь… Тады, у той вечар. Але не было. П'яны Саўка нагрузіў воз бярэзніку пад дугу. Мой Букет, увесь у шматках брудна-белай пены, дацягнуў воз, але на двары Саўкі ўпаў на калені.

Коні разабраны-падзелены даўно. Засталіся адно старыя ды жаравкі. Нават за маруду Беланоздрага, на якім раз праедзеш — і «наклюеш» азадак (такі востры і цвёрды ў яго хрыбет), былі спрэчкі ажно да бойкі…

— Бяры Сівую, — раіць мне Венька, а хлопцы рагочуць.

Сівая — кабыла рахманая, не маладая, але хуткая. Ды цяпер яна жарэбная, тоўстая… Куды на ёй верхам на танцы ў суседнюю вёску? Табе ж пятнаццаць гадоў, разумееш што-нішто… Ды яшчэ ў такі дзень…

У прыцемках ідзём на луг за канюшняй. Коні паварочваюць галовы ў наш бок, некаторыя і не апускаюць іх да ўжо роснай травы. Чакаюць. Калі на іх галовы чапляюць новыя, упрыгожаныя рознымі бляшкамі, аброці, пачынаюць узбуджана перабіраць капытамі, замінаюць распутаць. О, коні ведаюць, прадчуваюць: зараз будзе доўгая, у некалькі кіламетраў, вольная дарога праз туманны луг, дзе вершнікі будуць нібы здані, дзе густая трава глушыць стук капытоў. І коней не трэба будзе падганяць — яны будуць ляцець імкліва адзін за другім, быццам гэта не хлопцы скачуць навыперадкі да Рубанага, а самі коні…

— Давай, я завяжу пласцінку, — зноў прапаноўвае мне Венька.

Пласцінка ў мяне за пазухай. На ёй — «Клён». У дзяўчат на Рубаным ёсць такая, але тонкая, заезджаная, пагнутая… Іголка прайгравальніка скача па ёй, мелодыя перарываецца, паўтараецца, трашчыць і сіпіць… У мяне пласцінка новая. Чорная, гнуткая, але не тонкая. Сапраўдная, а не запісаная на кавалку пластыку ў студыі. Старэйшая сястра толькі ўчора прывезла з райцэнтра.

Венька — мой лепшы сябар. Яго Каштан лёгка б дамчаў нас дваіх, але тады ён прыйдзе ці не апошнім, а Венька заўсёды хоча быць першым. Таму я не прашуся…

Я абяцаў Тані, што прывязу сёння пласцінку. І яна абяцала, што будзе танцаваць тады толькі са мной… Хай і смехам тое казала, але ж мы пра ўсё кажам смехам, каб не стаць мішэнню для смешачак…

Я абяцаў. І працягваю Веньку пласцінку…

ТАНЯ адно вусны намачыла і адставіла кубачак з кавай.

— Як ты п'еш яе? Горкая ж…

— Ды мне… прывык… — губляюся я. — Ты нічога не спытала, дык я… вось падумаў…

Кавярня пустая, толькі я і Таня. Недзе праз гадзіну падцягнуцца мясцовыя маладзёны: папіць піва, пагуляць у більярд на вялікім стале, дзе зялёнае сукно даўно згубіла сваю цноту і яркасць, дзе вялікія дзіркі сцягнуты чорнымі ніткамі, а маленькія — ужо не празрыстым ад бруду скотчам.

— Хочаш, я вазьму чаю? Ці можа… тут няма ў вас віна добрага. Зараз я каньяку вазьму, толькі ж я за рулём…

— На халеру табе траціцца на той каньяк? — здзіўляецца Таня. — Гарэлкі лепш удвая болей…

Іду да барнай стойкі, прашу наліць сто гарэлкі і дзве шклянкі мінералкі. Паварочваюся са шклянкамі…

Няўтульная, з пахам восеньскай сыраці, падслепаватая зала вясковай кавярні. У рыжа-чырвоных разводах пластыкавых панэляў голыя сцены, шаравата-блакітны цюль на вялізных, амаль да падлогі, вокнах. Шэсць белых пластыкавых сталоў з крывава-чырвонымі пластыкавымі крэсламі. У адным развалілася вясковая баба. Ёй гадоў за 50. Ярка-жоўтая кітайская пухавая куртка расшпіленая, сіняя кофта пухліцца абвіслымі вялікімі цыцкамі і тлустым жыватом. Твар бабы ў мностве тонкіх крывавых сняжынак, нос пляскаты і трохі на баку. Я ведаю — гэта ў сямейнай бойцы муж зламаў ёй нос. Ссунутая на патыліцу хустка. Валасы сівыя, даўно не фарбаваныя. Баба глядзіць на мяне. Прадчуванне задаволенасці расцягвае яе вусны ва ўсмешку. Не, яна глядзіць не на мяне, на шклянкі…

ТАНЯ…

Вясёлая, рухавая, гнуткая. Яна ў танцы іншы раз датыкалася да мяне сваёй пругкай цыцачкай, знарок, а потым адхіналася, смяялася нязлосна, калі я адчувальна ўздрыгваў, хістаўся назад:

— А як рукой памацаеш, уцякаць пабяжыш?

— Не пабягу! — апошні раз дзёрзка адказаў я.

— Зараз пабачым!

Ніяк не чакаў, што яна схопіць маю бязвольную руку і прыкладзе ўмомант успацелую далонь да сваёй цыцачкі, ды яшчэ прыцісне.

Разам з перахапіўшым горла невядомым пачуццём на мяне ляціць яе позірк: незразумелы, ён пужае, ён прымушае знерухомець, застыць і чакаць нечага невыказна шчымлівага і страшнага адначасова.

— І праўда, не пабег...

Гасне незвычайны агеньчык у вачах Тані. Ці мне падалося толькі…

Я абяцаў ёй прывезці пласцінку. А яна — быць са мной разам увесь той вечар. І паказаць патаемнае месца — дзірку ў плоце саду аднаногага Піліпа, праз якую так блізка да паспелай малінаўкі…

Калі б у мяне быў конь…

Пласцінку адвёз Венька. І Венька назаўтра хваліўся нам, як разам з Танькай набралі яе поўную запазуху малінавак-паданак, як ён сам даставаў іх адтуль, нібыта доўга выбіраючы, лапаў Таньчыны халаднаватыя, як малінаўкі з начной травы, цыцачкі.

— А то ж, збылыць можна, — блазнаваў Венька, — па велічыні аднолькавыя і цвёрдзенькія.

І закочваў вочы.

У мой бок Венька стараўся не глядзець, быццам мяне і не было сярод хлопцаў.

Мой Букет паправіўся праз тыдзень.

Але я не паехаў больш на Рубанае.

***

Таня п'е гарэлку па глыточку, як я каву. Толькі часцей, чым я.

— А я от так жыву, — без адчаю выгуквае яна. — Ідзі мне яшчэ сотку вазьмі, а? Вып'ем за тое, што ў цябе тады не было каня…

■ Нефармат

БАБІНА ЛЕТА ЦІ ДЗЕДАВА ЗІМА?

У лістападзе здарылася колькі цёплых, нават яркіх сонечных дзён. У Брэсце дык наогул слупкі тэрмометраў паказалі вераснёўскую тэмпературу. Сіноптыкі кажуць, што быў пабіты тэмпературны рэкорд. Магчыма, і так. У дні, калі я звычайна згадваю словы Караткевіча: («Нават апоўдні на гонях туман, з адчаю хоць задавіся…»), падумалася, што бывае і не так, што можна яшчэ ўбачыць сонца, адчуць непаўторны водар восені. Тады я пазайздросціла мінчанам. Бо прачытала, як ЖКГ сталіцы выступіла з ініцыятывай не зграбаць і не вывозіць апалае лісце. У Брэсце чамусьці ініцыятыву не падтрымалі, і нашы дворнікі дашчэнту выграбалі апалы ўбор гарадскіх дрэў.

А так хацелася цёплым лістападаўскім днём удыхнуць пах лістоты і запомніць выпадкова падоранае прыродай лагоднае цяпло. З гэтымі думкамі я ішла апоўдні па вуліцы, па якой штодня хаджу на працу. Каля прадуктовай крамы нават заўважыла, што няма групкі заўсёднікаў — спецыфічнага кантынгенту, які круціцца тут з ранку да вечара. (Вось прыклад, калі людзі здабываюць грошы з паветра і ператвараюць іх у самы танны алкагольны напой!) Такім чынам, нічога не сапсавала лірычнага настрою і не перашкодзіла сузіранню. Я ўжо мінала кнігарню і падыходзіла да школы, як перада мной з'явілася жанчына. Менавіта з'явілася, бо не ішла насустрач, а выйшла збоку, з завулка.

— Дай колькі рублёў, — папрасіла яна проста, без усялякіх прадмоў.

Звычайна я не падаю такім папрашайкам. Тым больш, што спецыфічны колер твару ўказваў на яе звычайныя грашовыя траты. Але яна была не з тых, знаёмых, каго даводзілася бачыць штодня. І яшчэ… выраз твару быццам бы ўказваў на сляды няхай сабе і былога, але ж інтэлекту. Адным словам, я выняла з кашалька купюру і працягнула. «Дзякуй, — адгукнулася яна. — Жадаю, каб ты заўсёды давала і ніколі не прасіла!» Потым азірнулася і, усміхнуўшыся, дадала: «Прабач, атрымалася двухсэнсоўна, я мела на ўвазе грошы».

Мне чамусьці стала шкада гэтую жанчыну. У галаве ўзнікалі сюжэты яе нешчаслівага лёсу, трагічнага кахання, здрады. І зусім не хацелася раўняць яе з тым спецыфічным кантынгентам, пра які зараз актыўна гаворыцца ў краіне. Але… Вось так разбіваюцца ілюзіі. Бо калі я вярталася назад са свайго непрацяглага праменаду, убачыла гераіню нядаўняга роздуму ў кампаніі прывычных алкаголікаў бамжаватага выгляду з гэтай вуліцы, якіх яна разносіла рознымі словамі. Па ўсёй верагоднасці, за тое, што прынеслі менш грошай у агульную дзённую скарбонку.

Каб канчаткова не згубіць свой лірычна-асенні настрой, калі вярнулася ў кабінет, набрала ў пошукавіку «жоўтае лісце». І той выдаў мне блог адной юнай пінчанкі на адным з пінскіх сайтаў. Прызнаюся шчыра, чытаць было весела. Дзяўчына расказвала пра незвычайную забаву групкі старшакласніц. Сваю асеннюю, так бы мовіць, фотасесію паненкі вырашылі правесці ў парку, выкарыстаўшы для гэтага гурбы лісця, якія нядаўна намялі працавітыя дворнікі. Дзяўчынкі абсыпалі адна адну рознакаляровай лістотай і фіксавалі сюжэты на айфоны. Было зразумела, што хочуць папоўніць свае старонкі ў сацыяльных сетках новымі фота. І праўда, праз колькі гадзін яркія асеннія ілюстрацыі з'явіліся ў інтэрнэце. Пра тое, што юныя мадэлі разнеслі ўшчэнт вынікі дзённай работы супрацоўнікаў ЖКГ, у сацыяльных сетках не паведамлялася. А вось пра парк, пра апошнюю пазалоту лістоты — колькі заўгодна. І вось пад вечар з'явіўся яшчэ адзін каментарый: азваліся хлопцы, якія паведамілі, што напярэдадні… справілі малую патрэбу ў тую самую кучу лісця.

Вядома, праз кароткі адрэзак часу фотаздымкі на фоне асенняй лістоты з сетак зніклі. Было відавочна, што не толькі ў мяне не складваецца з лірызмам апошніх цёплых дзён, якія некаторыя паспяшаліся нават назваць бабіным летам-2.

Вечарам сустрэлася з пляменніцай, якая гуляла са сваім пяцігадовым сынам. Загаварылі, вядома, пра надвор'е, пра гэтыя прыгожыя дні, якія хутка прамінуць. Сарвалася і словазлучэнне «бабіна лета»… Тут падзьмуў вецер, і малы, што ўважліва слухаў нас, глыбей нацягнуў шапку і вымавіў: «Гэта не бабіна лета, а нейкая дзедава зіма».

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Космас

КАМЕТА НАМ РАСКАЖА ПРА ЎЗНІКНЕННЕ ЖЫЦЦЯ?

ЦЯПЕР ДАСЛЕДЧЫ МОДУЛЬ «ФІЛЫ» ЦАЛКАМ РАЗРАДЗІЎСЯ І «ЗАСНУЎ» МІНІМУМ ДА НАСТУПНАГА ЛЕТА

Навукоўцы пачалі атрымліваць здымкі з ляцельнага апарата, які ўпершыню ў гісторыі здзейсніў пасадку на камету. Экспедыцыя пачалася ў 2004 годзе. Еўрапейскі зонд «Разета» быў запушчаны да кометы Чурумава-Герасіменкі, якая была адкрыта савецкімі навукоўцамі яшчэ 45 гадоў таму. Працягласць палёту «Разеты» склала дзесяць гадоў восем месяцаў і адзінаццаць дзён. А менавіта гэтымі днямі адбылася першая ў свеце мяккая пасадка спускальнага апарата «Філы» на паверхню кометы. За гэтай падзеяй у рэжыме прамой трансляцыі назіралі ў Цэнтры кіравання палётамі ў нямецкім горадзе Кёльн.



▲ Сам модуль выглядае так.

▶ Выява кометы, зробленая модулем Philae 12 лістапада 2014 года на адлегласці каля 3 км ад паверхні ў маштабе прыкладна 3 м на піксель.

Мэта палёту — даследаваць хімічную і фізічную структуру грунту, каб узбагаціць веды аб зараджэнні Сусвету. Лічыцца, што на нябесным целе, узрост якога прыкладна 4,5 мільярда гадоў, захавалася так званае першарэчыва. Даследчы модуль «Філы», які паспяхова высадзіўся на камету Чурумава-Герасіменкі, перадаў навукоўцам першы панарамны здымак у добрай якасці. Мяркуючы па фота, у ядра кометы грузаватая паверхня, пакрытая расколінамі. Але цвёрдая яна ці рыхлая, меркаваць пакуль нельга.

Ядро кометы — гэта рэшткі рэчываў, з якіх сфармавалася сонечная сістэма, з якіх узнікла ў тым ліку і Зямля, і, можа быць, рэшткі таго рэчыва, якое паслужыла першаснымі будаўнічымі блокамі для ўзнікнення на Зямлі жыцця. Вядома, нам вельмі цікава зазірнуць у сваё мінулае на 4,5 мільярда гадоў таму, лічаць навукоўцы.

Прыборы, якімі абсталяваны «Філы», могуць не толькі вывучыць паверхню кометы. Радыёлакацыйныя сістэмы на «Разеце» і яе модулі здольныя прасвяціць нябеснае цела наскрозь і атрымаць інфармацыю аб яго ўнутранай структуры. Адным словам, калі ўсё складзецца добра, то чалавецтва можа атрымаць бясцэнныя звесткі аб сваім паходжанні, калі не — сур'ёзны вопыт, які, напэўна, будзе выкарыстаны яшчэ не раз. Як ніяк, упершыню ў гісторыі вынаходка чалавека здолела «асядлаць» камету… Даследчыкі назвалі гэтую ўнікальную місію «касмічнай археалогіяй».

На жаль, але місія зонда «Разета» на камеце часова прыпынена. Цяпер даследчы модуль «Філы» цалкам разрадзіўся і не зможа ўключыцца ў бліжэйшы час. Віной усяму стала няўдалая пасадка робата са сваёй нагі на паверхню. Гэта не дазваляе яму атрымліваць дастатковую для працягу місіі колькасць сонечнага святла. Навукоўцы спадзяюцца выправіць становішча пры падлёце кометы да Сонца. Але гэта адбудзецца не раней лета наступнага года. Радуе тое, што за час сваёй кароткай місіі робат змог сабраць і адправіць на «Разету» вялікую колькасць інфармацыі, у тым ліку аб саставе паверхні кометы Чурумава-Герасіменка. У бліжэйшы час навукоўцы расшыфруюць і апублікуюць атрыманыя звесткі.

Сяргей КУРКАЧ

Проектная декларация застройщика от «20» ноября 2014 г.

Сведения о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «Триумфстрой», зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом решением от 9 июля 2003 г. № 1124. Свидетельство о государственной регистрации № 190465926 выдано 15 июля 2003 г.

Местонахождение: 220121, г. Минск, ул. Евфросиньи Полоцкой, дом 1, офис №117а, кабинет 12.

Режим работы: Понедельник – Пятница 8.30 – 17.00; перерыв на обед 12.30 – 13.00.

Сведения о проектах строительства жилых домов, введенных в эксплуатацию за последние три года:

- 16-этажный двухсекционный, 111-квартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по ул. Е.Полоцкой, 1, площадью – 13699,6 м^2;

- 10-этажный двухсекционный, 49-квартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по ул. Е.Полоцкой, 3, площадью – 5467,9 м^2;

- 10-этажный трехсекционный, 124-квартирный жилой дом по ул. Жуковского, 29Б, площадью 9933,8 м^2.

Цель проекта: строительство объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями бытового обслуживания и гараж-стоянкой по ул. П.Глебки» (без инженерных сетей).

Сведения об этапах и сроках реализации: Начало строительства – август 2014 г.

Нормативный срок ввода в эксплуатацию – февраль 2016 г. Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – сентябрь 2016 г.

Сведения о генеральной подрядной организации – СУ-26 ОАО «Стройтрест № 4». Договор № 01/26-2014 от 21.07.2014 г.

Застройщиком получены:

- акт выбора места размещения земельного участка площадью 0,4713 га утверждённый Председателем Минского городского исполнительного комитета 31.10.2012 г.;

- решения Минского городского исполнительного комитета от 27.02.2014 г. № 458;

- разрешение на организацию стройплощадки № 2-208Ж-038/14 от 04.08.2014 г., разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-208Ж-038/14 от 01.09.2014 г. Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску;

- заключение КАиГ МГиК от 29.07.2013 г. № 07-29/115 Ф, от 28.02.2014 г. № 02-28/80 Ф;

- свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка № 500/1312-3071 от 04.04.2014 г .

Застройщиком получены положительные заключения по проекту:

